WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 ЛІПЕНЯ 2010 г.
СЕРАДА
№ 140
(26748)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ДЗЯРЖАВА БУДЗЕ САДЗЕЙНІЧАЦЬ ПАШЫРЭННЮ НАПРАМКАЎ ВЫТВОРЧАСЦІ КАСМІЧНАЙ ТЭХНІКІ

Даходы ад работы прадпрыемстваў касмічнай галіны Беларусі ў перспектыве павінны дасягнуць $1 млрд. Аб гэтым 20 ліпеня, наведваючы ААТ «Пеленг», заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

«Краіна павінна мець іншае аблічча. Гэты напрамак трэба выводзіць на мільярдныя рубяжы. Што трэба — будзем дапамагаць. Гэта іншыя рубяжы, іншы менталітэт нацыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён даручыў, зыходзячы з той навукова-тэхнічнай базы, якая ёсць у рэспубліцы, вызначыць напрамкі з ліку перадавых, дзе Беларусь можа сама вырабляць высокатэхналагічную і высокаканкурэнтную прадукцыю. У далейшым з іх будуць адабраны каля 10 найбольш перспектыўных напрамкаў, рэалізацыяй якіх зоймуцца таленавітыя спецыялісты. «Сялка, трактар, камбайн — гэта добра, але касмічныя тэхналогіі — вось што галоўнае. Трэба дакладна паставіць задачы ўсім: ідзіце і рабіце, не хочаце — адыдзіце», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт азнаёміўся з самымі новымі распрацоўкамі прадпрыемства. Ён агледзеў канструктарскі аддзел, участкі оптыка-механічных блокаў, паверхневага мантажу, а таксама зборкі касмічнай тэхнікі навукова-канструктарскага ўпраўлення «Космас», рэнтгеназкапічную лабараторыю.

Сёння галоўная арыентацыя ААТ — гэта стварэнне прыбораў грамадзянскага прызначэння і распрацоўкі ў сферы касмічных тэхналогій. Прадпрыемства спецыялізуецца на распрацоўцы і выпуску сістэм навядзення, касмічнай тапаграфічнай здымачнай апаратуры і фотаграмметрычнай тэхнікі, прыбораў для траекторных вымярэнняў, а таксама розных прыбораў грамадзянскага прызначэння.

У прыватнасці, прадпрыемства стварыла абсталяванне для беларускага касмічнага апарата БелКА, запуск якога плануецца ў першым квартале 2011 года. Рашэнне аб стварэнні беларускага спадарожніка і работа ў гэтай сферы далі магчымасць прадпрыемству мець стабільныя заказы на свае распрацоўкі. Усяго за сваю гісторыю ААТ «Пеленг» прымала ўдзел у запуску 35 касмічных апаратаў. Выраблёная ў Беларусі тэхніка сёння, напрыклад, устанаўліваецца на расійскія спадарожнікі тыпу «Канопус».

Прадпрыемства выпускае розную оптыка-электронную тэхніку. Вялікім попытам карыстаецца мікраскоп параўнання, які прымяняюць у сваёй рабоце крыміналісты. ААТ «Пеленг» таксама асвоіла выпуск шырокай лінейкі метэаралагічнага абсталявання для метэастанцый. Цяпер такая метэастанцыя праходзіць выпрабаванні на адным з аэрадромаў у Расіі. Акрамя таго, прадпрыемства спецыялізуецца на распрацоўцы і вытворчасці ахоўных сістэм граніцы і розных аб'ектаў.

Як адзначыў генеральны дырэктар прадпрыемства Уладзімір Пакрышкін, у ААТ «Пеленг» ёсць заказы на прадукцыю, якая вырабляецца, і канкрэтныя прапановы ад замежных партнёраў. Цяпер партфель заказаў, па якіх вядуцца перагаворы, складае каля $130 млн. Прадпрыемства працуе без страт, фінансава ўстойлівае. ААТ «Пеленг» выконвае ўсе свае абавязацельствы па заключаных кантрактах і дагаворах. Ужо цяпер на 2011 год заключаны кантракты на агульную суму Br169 млрд (95 працэнтаў ад планавага аб'ёму на 2010 год).

Значныя сродкі ў свой час былі ўкладзены ў мадэрнізацыю і развіццё вытворчасці, што дало магчымасць асвоіць выпуск новых канкурэнтаздольных відаў прадукцыі.

Аднак прадпрыемства не спыняецца на дасягнутым. Так, Прэзідэнт агледзеў будуемы корпус па зборцы і выпрабаваннях касмічнай тэхнікі. Вырашана, што да 7 лістапада гэтага года ўсе будаўнічыя работы на гэтым аб'екце павінны быць завершаны, пасля чаго можна будзе пачаць напаўненне будынка неабходным абсталяваннем (яно ўжо набыта).

Важна, што значная частка абсталявання для вытворчасці і выпрабаванняў касмічнай апаратуры створана беларускімі спецыялістамі. Сёння, паводле слоў Уладзіміра Пакрышкіна, можна смела сцвярджаць, што ў нашай краіне створана самастойная падгаліна прамысловасці — вытворчасць касмічнай тэхнікі.

Аляксандр Лукашэнка, падводзячы вынікі сённяшняй рабоце на ААТ «Пелег» падкрэсліў, што дзяржава абавязкова будзе ўкладваць неабходныя сродкі ў развіццё гэтай падгаліны і садзейнічаць пашырэнню напрамкаў вытворчасці касмічнай тэхнікі ў Беларусі.

Пакідаючы будуемы аб'ект, што быў апошнім у праграме наведвання ААТ «Пеленг», Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на непрыглядныя складскія і вытворчыя памяшканні, якія належаць прадпрыемству «БелОМА», у прыватнасці цэх па раскроі металу. Кіраўнік дзяржавы зайшоў у гэты цэх, пасля чаго даручыў гарадскім уладам сумесна з кіраўніцтвам прадпрыемства прапрацаваць магчымасць пераносу гэтай вытворчасці ў іншае месца, звярнуўшы ўвагу на тое, што гэтыя памяшканні павінны выкарыстоўвацца з большай карысцю. Пры гэтым размова ідзе не проста аб пераносе, а фактычна аб стварэнні больш сучаснай і эфектыўнай вытворчасці.

Каля 80 працэнтаў скаргаў па выніках першага этапа маніторынгу якасці работы органаў улады адносяцца да кампетэнцыі мясцовай улады

Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку даложаны вынікі першага этапа праведзенага па яго даручэнні маніторынгу якасці работы органаў улады са зваротамі грамадзян.

Членамі 9 міжведамасных рабочых груп вывучана дзейнасць у гэтай сферы абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў, 18 райвыканкамаў, 4 адміністрацый раёнаў г. Мінска і 24 сельвыканкамаў. У рэгіёнах праведзены 22 асабістыя прыёмы і прыняты 1362 чалавекі. Арганізаваны гарачыя тэлефонныя лініі, у час якіх паступіла каля тысячы званкоў.

Аналіз паступіўшых зваротаў паказаў, што амаль 80 працэнтаў скаргаў адносіліся да кампетэнцыі мясцовай улады. У ліку самых вострых пытанняў, якія патрабуюць першачарговага вырашэння, людзі назвалі пытанні землекарыстання і землеўпарадкавання, будаўніцтва жылля (высокі кошт, расцягнутыя тэрміны, нізкая якасць).

34 працэнты зваротаў датычацца сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у тым ліку значная частка з іх — пытанняў правядзення капітальнага рамонту жылых дамоў. Пастаянныя пераносы тэрмінаў, адсутнасць кантролю за ходам і якасцю выканання рамонтных работ выклікаюць абгрунтаванае нездавальненне грамадзян. Шмат нараканняў у насельніцтва праваных раёнаў выклікае работа мясцовых органаў улады па аказанні дапамогі ў вядзенні асабістых падсобных гаспадарак. Вяскоўцы скардзяцца на нізкі ўзровень арганізацыі збору малака, неадпаведнасць колькасных і якасных паказчыкаў малака ў малаказборшчыкаў і на малаказаводах, несвоечасовыя разлікі з насельніцтвам за здадзеныя жывёлу і малако.

Масава заявілі аб сваёй праблеме ашуканыя дольшчыкі. Кіраўнік дзяржавы даручыў прыняць вычарпальныя меры, якія не дапускалі б такіх сітуацый у краіне. Сярод заўваг, якія найбольш часта называліся, — недастатковы ўзровень культуры размовы з людзьмі, фармальныя, бюракратычныя адносіны да вырашэння праблем грамадзян, недахоп чалавечай увагі да простых людзей.

Паводле ўказання Прэзідэнта ўсе вусныя і пісьмовыя звароты, што паступілі ў ходзе маніторынгу, узяты на кантроль і накіраваны для аб'ектыўнага і прафесійнага вырашэння. Па выяўленых фактах валакіты, грубасці, іншага неналежнага разгляду скаргаў і заяў грамадзян павінны быць прыняты самыя строгія меры рэагавання, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Старшыням аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама даручана прааналізаваць акрэсленыя праблемы і прыцягнуць да самай строгай адказнасці (аж да звальнення) службовых асобаў, якія дапусцілі недахопы ў рабоце з насельніцтвам. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў прадоўжыць маніторынг стану работы мясцовых органаў з насельніцтвам, пашырыўшы формы рэальнай і дзейснай сувязі з грамадзянамі краіны.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

(Падрабязнасці на 2-й стар.)

Рэпартаж у нумар

КАЛІ ЛЕСУ ГОРАЧА

Пілот-назіральнік Уладзімір ПІРОГ і дэсантнікі-пажарныя Сяргей САВУЦІН і Арцём Ліпаўка вярнуліся з чарговага лесапатрульнага палёту.

— Відаць, надыходзяць сур'ёзныя выпрабаванні, — без жартаў кажа лётчык-назіральнік Уладзімір Пірог, змахваючы кроплі поту пасля трох гадзін, праведзеных у гарачай пілоцкай кабіне Мі-2. Відавочна, што ён задаволены: за час палёту выявіў сур'ёзнае лясное ўзгаранне. Яно не толькі выяўлена, але і ліквідавана сіламі пажарна-дэсантнай брыгады. Выратаваны вялікі лес! Каб лесапатруль своечасова не апынуўся там, дзясяткі гектараў жывой зямлі ператварыліся б у мёртвы попел.

— Калі б заўважылі пажар на гадзіну пазней, агонь знішчыў бы не дзве соткі, а болей за гектар лесу, — кажа назіральнік. — Пясчаная глеба ў Дрэтуньскіх лясах у небяспечны сезон ператварае лес у сапраўдны порах. Ды ці далі б тады рады агню два дэсантнікі?

Пасля дазапраўкі і невялікага адпачынку верталёт зноў становіцца на загадзя вызначаны курс паветранага патрулявання. Але знаёмы і вывучаны да дробязяў маршрут можа імгненна напоўніцца нечаканасцямі, і тады палёт будзе праходзіць ад пажару да пажару. Амаль гэтак і атрымалася на другім коле палёту: вяртаючыся на аэрадром Полацкага аддзялення, экіпаж заўважыў прывід дыму і ўзяў курс на поўнач. Без малога паўсотні кіламетраў давялося ляцець — як аказалася, у Расонскі раён, амаль на мяжу з Расіяй.

— Юхавіцкае лясніцтва не ведала пра гэтае ўзгаранне, — каментуе палёт Уладзімір. — Мы зафіксавалі яго першымі і добра, што ў пачатковай стадыі. На жаль, мы не маглі болей рабіць пасадкі, бо ў верталёце заканчвалася паліва. Давялося звязвацца з лясніцтвам па радыёстанцыі, а самім хутчэй вяртацца на базу.

Калі дзённыя тэмпературы зашкальваюць (хоць плюс трыццаць і вышэй, бадай, становіцца для нас звычайным), службе паветранай аховы лесу не да адпачынку пад промнямі беларускага сонца. Апошнімі днямі, нягледзячы на тое, што дзе-нідзе праліліся дажджы, авіятэхніка дзяржаўнага ўнітарнага прадпрыемства авіяцыйнай аховы лясоў «Беллесавія» пры Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях (а гэта 15 паветраных суднаў) была на крыле. Падстава цалкам зразумелая: шматдзённая гарачыня — першапрычына лясного пажару. Клас гарымасці, як паведамляюць сіноптыкі, дасягаў 3-й і 4-й ступеняў. Хоць першымі прычынамі, насамрэч, з'яўляюцца чалавечая халатнасць альбо шкодніцтва. Верагодней за ўсё, гэтак было і ў нядзельную раніцу ў лесе на колішнім Дрэтуньскім палігоне, дзе пажар узнік неўзабаве пасля сыходу збіральнікаў ягад.

СТАР. 4

Лес гарэў не на жарты.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Памер сярэдняй працоўнай пенсіі ў Беларусі ў ліпені складае Br475,5 тыс.

У Беларусі сярэдняя пенсія ўсіх відаў склала ў ліпені Br469,7 тыс., паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў галоўным упраўленні пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Сярэднямесячная пенсія ўсіх відаў у студзені—ліпені гэтага года ўзрасла на 20,1 працэнта ў параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам.

Памер сярэдняй працоўнай пенсіі ў ліпені гэтага года складае Br475,5 тыс., сярэднямесячная працоўная пенсія ў студзені—ліпені гэтага года павялічылася на 20,3 працэнта да адпаведнага перыяду мінулага года.

Сярэдняя пенсія па ўзросце ў ліпені складае Br491,9 тыс., мінімальная па ўзросце (з улікам даплаты да яе) — Br271,1 тыс. Сярэдняя пенсія па інваліднасці складае Br431,4 тыс., з прычыны страты карміцеля — Br286,7 тыс., за выслугу гадоў — Br645,9 тыс., за асаблівыя заслугі перад рэспублікай — Br720,3 тыс.

Сярэдні памер сацыяльнай пенсіі складае ў ліпені гэтага года Br198,7 тыс. Сярэднямесячны памер сацыяльнай пенсіі ў студзені—ліпені 2010 года ўзрос на 9,3 працэнта ў параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам.

Што датычыцца разліковых паказчыкаў, то максімальная пенсія па ўзросце для непрацуючых пенсіянераў (пры стажы 40 гадоў у жанчын і 45 гадоў у мужчын і індывідуальным каэфіцыенце заробку 4,0 і вышэй) складае Br764 тыс. 250. Максімальная пенсія па ўзросце для непрацуючых пенсіянераў з ліку былых шахцёраў пры стажы падземнай работы не менш як 10 гадоў у мужчын і 7,5 года ў жанчын — Br973 тыс. 730, пры стажы работы на асобных відах падземных і адкрытых горных работ не менш як 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын — Br1 млн 183 тыс. 220. Максімальная пенсія па ўзросце для працуючых пенсіянераў (пры індывідуальным каэфіцыенце заробку 1,3 і вышэй) — Br554 тыс. 760.

Мінімальны памер пенсіі па ўзросце складае ў ліпені Br66 тыс. 560 (гэты нарматыў прымяняецца пры вылічэнні сацыяльных пенсій, надбавак і павышэнняў да пенсій, ён складае 25 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва).

На ўліку ў органах па працы, занятасці і сацабароне Беларусі знаходзіцца 2 млн 464,1 тыс. пенсіянераў.

Ва Урадзе

РАСПРАЦАВАНЫ ПРАЕКТ НОВАЙ ПРАГРАМЫ ПА ПЕРААДОЛЕННІ НАСТУПСТВАЎ КАТАСТРОФЫ НА ЧАЭС НА 2011—2015 ГАДЫ

На ліквідацыю наступстваў аварыі ў бліжэйшыя 5 гадоў запланавана 6,6 трыльёна рублёў

СЁЛЕТА завяршаецца рэалізацыя мерапрыемстваў дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС на 2006—2010 гады. Аднак значныя маштабы радыяцыйнага забруджвання, комплексны характар задач радыяцыйнай абароны насельніцтва і рэабілітацыя пацярпелых тэрыторый вымушаюць працягваць і надалей работы, не толькі накіраваныя на ліквідацыю наступстваў катастрофы, але і здольныя забяспечыць устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых рэгіёнаў. Апошняе, між іншым, паводле слоў міністра па надзвычайных сітуацыях Энвера Барыева, стане прыярытэтным у новай праграме па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС на 2011—2015 гады і на перыяд да 2020 года, праект якой абмяркоўваўся на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі.

Як заўважыў міністр у гутарцы з журналістамі перад пасяджэннем Прэзідыума, Беларусь ужо знаходзіцца не ў тым стане, — калі мы мелі патрэбу ў гуманітарнай дапамозе і найбольш тэрміновых захадах. «Мы перайшлі на этап, — падкрэсліў ён, калі неабходна ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёнаў і праграма, накіраваная на наданне імпульсу гэтаму працэсу». Асноўныя ж мерапрыемствы новай праграмы сканцэнтраваныя ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях, якія, як вядома, пацярпелі найбольш з-за аварыі.

Прадстаўляючы Ураду праект праграмы, Энвер Барыеў паведаміў, што ў ёй выдзеленыя чатыры асноўныя напрамкі, а пастаўленыя задачы патрабуюць значнай фінансавай падтрымкі.

СТАР. 2

Паритетбанк

ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Гамарника, 9/4

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 г.

ОАО «Паритетбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2010	01.07.2009
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	11 314,9	10 131,9
3	Средства в Национальном банке	1102	40 727,2	10 766,3
4	Ценные бумаги:	1103	1 573,0	19 230,7
	для торговли	11031	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	-	-
	в наличии для продажи	11033	1 573,0	19 230,7
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	83 076,6	68 779,0
6	Кредиты клиентам	1106	282 612,0	211 779,1
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	69,7	16,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	27 919,8	19 524,0
9	Прочие активы	1109	14 815,3	5 881,7
10	ИТОГО активы	110	462 108,5	346 108,7
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	50 000,0	100 000,0
13	Кредиты и другие средства банков	1205	61 174,6	37 197,0
14	Средства клиентов	1206	178 355,5	90 685,0
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	41 208,7	1 172,3
16	Прочие обязательства	1209	5 900,9	4 770,4
17	ВСЕГО обязательства	120	336 639,7	233 824,7
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	93 368,4	93 368,4
20	Эмиссионный доход	1212	-	-
21	Резервный фонд	1213	4 835,8	1 555,9
22	Накопленная прибыль	1214	19 686,7	10 516,1
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	7 577,9	6 843,6
24	ВСЕГО капитал	121	125 468,8	112 284,0
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	462 108,5	346 108,7
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	296 962,1	175 145,0
28	Обязательства	1302	168 055,0	63 977,4

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 г.

ОАО «Паритетбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2010	01.07.2009
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	27 268,3	22 185,9
2	Процентные расходы	2012	10 808,1	11 778,0
3	Чистые процентные доходы	201	16 460,2	10 407,9
4	Комиссионные доходы	2021	3 846,4	2 352,4
5	Комиссионные расходы	2022	527,3	204,0
6	Чистые комиссионные доходы	202	3 319,1	2 148,4
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	2 700,1	2 753,7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(-14,8)	151,5
9	Доход в форме дивидендов	205	0,3	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	991,8	2 059,8
11	Прочие доходы	207	1 510,1	1 207,9
12	Операционные расходы	208	12 370,4	9 759,6
13	Прочие расходы	209	1 638,1	1 735,0
14	Налог на прибыль	210	1 483,4	-
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	7 491,3	3 115,0

Председатель Правления С.Л. Панковец

Главный бухгалтер М.М. Абраменко

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.

НАРАДЗІЎСЯ 16 ЛІПЕНЯ Ў ГРОДНЕ!

Дыплом і каштоўны падарунак мэр Гродна Барыс Казялкоў уручыў супрацоўніку Гродзенскага РАУС Андрэю Фарысю, у якога ў 00.05 16 ліпеня нарадзіўся сын.

Гэта ўжо добрая традыцыя — 16 ліпеня, у дзень святкавання вызвалення горада над Нёманам ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Гродзенскі гарвыканкам і гарадская арганізацыя рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» ушаноўваюць першае дзіця, якое нарадзілася ў гэты дзень у абласным цэнтры.

Звання «Ганаровы грамадзянін Гродна» таксама традыцыйна ў святочны дзень удастоены ветэран Вялікай Айчыннай вайны, адзін з вызваліцеляў Гродна Аляксандр Рашатняк, рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Яўген Роўба і мастак-графік Юрый Якавенка. А імёны былога кіраўніка РЭУ «Гроднаэнерга», ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Івана Чыжанка і былога загадчыка кафедры філасофіі ГрДУ імя Янкі Купалы Віктара Калакольнікава занесеныя ў Кнігу славы Гродна.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАЛЯКІ ЎСУМНІЛІСЯ Ў КАМПЕТЭНТНАСЦІ МІЖНАРОДНАГА АВІЯЦЫЙНАГА КАМІТЭТА

Польская версія часопіса Newsweek усумнілася ў кампетэнтнасці Міжнароднага авіяцыйнага камітэта (МАК), які расследуе акалічнасці крушэння самалёта Ту-154 прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага пад Смаленскам.

У апублікаваным 19 ліпеня артыкуле пад назвай «МАК: карумпаваныя кіраўнікі неба?» выказваюцца здагадкі, што ведамства, адказнае за расследаванне авіякатастроф на тэрыторыі краін СНД, часта выносіць не адпаведныя рэчаіснасці вердыкты.

У прыватнасці, журналісты зважаюць на катастрофу аэробуса «Армавія» ў 2006 годзе. Тады чыннікам гібелі ўсіх 113 чалавек, якія знаходзіліся на борце самалёта, была прызнана памылка пілотаў, аднак авіякампанія не пагадзілася з высновамі МАК. У Newsweek сцвярджаецца, што адным з чыннікаў, па якім пілоты страцілі арыентаванне ў прасторы, была няспраўнасць абсталявання аэрапорта ў Сочы, які быў сертыфікаваны камітэтам. Называюцца і іншыя выпадкі, калі МАК расследаваў інцыдэнты, чыннікам узнікнення якіх магло стаць абсталяванне, ухваленае камітэтам. Варта адзначыць, што расследаванне чыннікаў авіякатастрофы пад Смаленскам, у выніку якой загінулі высокапастаўленыя польскія чыноўнікі і вайскоўцы, пакуль што не завершана.

АКТЫВІСТАЎ «ІНШАЙ РАСІІ» ЗАТРЫМАЛІ НА АКЦЫІ Ў ПАДТРЫМКУ АМБУДСМЕНА

Супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі чатырох актывістаў руху «Іншая Расія». Як паведамляе «Інтэрфакс», усе чацвёра бралі ўдзел у несанкцыянаванай акцыі каля будынка Генеральнай пракуратуры РФ у падтрымку ўпаўнаважанага па правах чалавека Уладзіміра Лукіна.

Актывісты, якія патрабавалі «спыніць ганенне» амбудсмена, паспрабавалі перакрыць вуліцу Вялікая Дзмітраўка. Колькі менавіта чалавек удзельнічала ў акцыі, не паведамляецца. Таксама невядома, якія меры будуць прынятыя ў дачыненні да затрыманых.

Раней з патрабаваннем спыніць кампанію «ганення» Лукіна выступілі вядомыя расійскія праваабаронцы. Паводле іх меркавання, у сродках масавай інфармацыі разгорнутая кампанія па дыскрэдытацыі амбудсмена ў сувязі з яго пазіцыяй з нагоды разгонаў мітынгаў на Трыумфальнай плошчы. У прыватнасці, Лукін заяўляў аб празмернай жорсткасці супрацоўнікаў міліцыі, а таксама паказваў на неабгрунтаванасць забаронаў на правядзенне акцый 31 мая.

РАСІЯ ЗДЗІВІЛА ЭСТОНІЮ, ЗМЯСЦІЎШЫ «ІСКАНДЭРЫ» Ў ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Кіраўнік Мінабароны Эстоніі Як Аавіксоо заявіў, што для НАТА не стала неспадзеўкай размяшчэнне Расіяй ракетных комплексаў на тэрыторыі Ленінградскай ваеннай акругі, але з улікам цяперашніх адносінаў паміж Расіяй і НАТА гэты крок незразумелы, паведаміла прэс-служба Мінабароны Эстоніі.

«Мэтай НАТА ў адносінах з Расіяй за апошнія два дзесяцігоддзі было добразычлівае паразуменне. Зычлівасць не азначае наіўнасць, і таму для нас не стала неспадзеўкай рашэнне Масквы размясціць ракетныя комплексы «Іскандэр» у Калінінградскай вобласці», — сказаў Аавіксоо. Паводле слоў міністра абароны, працягам стратэгічнага мыслення стала размяшчэнне «Іскандэраў» у Ленінградскай ваеннай акрузе. Міністр падкрэсліў, што хоць ваенныя магчымасці расійскіх ракетных комплексаў «не варта перабольшваць», тым не менш яны могуць уяўляць пагрозу ў радыусе 400 км, што пакрывае частку тэрыторыі Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі і Літвы.

ЗА РАКАЎ ДАВЯДЗЕЦЦА ЗАПЛАЦІЦЬ

Слесар і муляр з г. Іванава на вадасховішчы каля в. Дастоева вырашылі налавіць вузкапалых ракаў. Пры дапамозе забароненых прыладаў яны ўхапілі больш за 40 асобінаў. Інспекцыя браканьераў затрымала і налічыла ім 2 млн 370 тысяч штрафу. Неўзабаве тут затрымалі яшчэ двух браканьераў з 31 ракам. Беспрацоўнаму і рабочаму цагельнага завода давядзецца выплаціць 1 627 500 рублёў. Заведзены крымінальныя справы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.07.2010 г. (для б/н разлікаў)

▼1 долар ЗША	2 983,00	1 чэшская крона	152,96
▼1 еўра	3 869,85	1 польскі злоты	939,38
1 латвійскі лат	5 463,37	▲1 расійскі рубель	98,11
1 літоўскі літ	1 121,77	1 украінская грыўня	377,62

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,4058
10 UAH	38,5113
1000 BYR	10,1658
EUR	39,5306

Агенцтва Уладзіміра Грыўцова

ОРДЭНАЎ, МЕДАЛЁЎ І ГАНАРОВЫХ ЗВАННЯЎ УДАСТОЕНЫ 33 РАБОТНІКІ РОЗНЫХ СФЕР ДЗЕЙНАСЦІ

За высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у развіццё дарожнага будаўніцтва, прамысловасці, адукацыі, аховы здароўя, навукі і культуры 33 чалавекі ўдастоены ордэнаў, медалёў і ганаровых званняў. Гэта прадугледжана ўказам № 370, які падпісаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

У прыватнасці, ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны мастак-жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў Мікалай Казакевіч. Медаля «За працоўныя заслугі» ўдастоены работнік ААТ «Мостаатрад № 425» Дзмітрый Аўсянікаў, машыніст РУП «Мостабуд» Дзмітрый Валчок, дырэктар выдавецтва «Пачатковая школа» Наталля Ваніна, загадчык аддзела ўстановы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта «Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем» Фёдар Капуцкі, дырэктар вытворчага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Ніць» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства сляпых» Сяргей Кузняцоў, загадчык аддзялення Гомельскай абласной клінічнай бальніцы Іван Чамерка, намеснік галоўнага ўрача Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Леанід Швідлер.

Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны дацэнт кафедры інтэр'ера і абсталявання Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Віктар Барабанцаў.

Ганаровае званне «Народны мастак Беларусі» прысвоена загадчыку кафедры малюнка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзіміру Тоўсціку, ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь» — вядучаму праграмы дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Аляксандру Аверкаву, дырэктару Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Наталлі Бярозкінай, мастаку-скульптару, члену Беларускага саюза мастакоў Уладзіміру Слінчанку. Ганаровага звання «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь» удастоены галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута тэхнічнай акустыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Клубовіч, ганаровага звання «Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь» — генеральны дырэктар Дарожна-будаўнічага трэста № 1 г. Віцебска Аляксандр Калкоў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Падрабязнасці

МАНІТОРЫНГ РАБОТЫ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ АДМІНІСТРАЦЫЯЙ ПРЭЗІДЭНТА ДАЎ МАГЧЫМАСЦЬ ВЫРАШЫЦЬ ЗА НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ТОЕ, ШТО ВАЛАКІЦІЛАСЯ ГАДАМІ

У выніку маніторынгу работы мясцовай улады з грамадзянамі выяўлены факты бюракратызму, валакіты і карупцыі, якія, пасля выяўлення, былі аператыўна вырашаны і ўстаранёны. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведамілі ў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, каментуючы вынікі праверкі міжведамаснымі рабочымі групамі стану спраў на месцах па арганізацыі работы з грамадзянамі, разгляду іх зваротаў і вырашэнні надзённых праблем насельніцтва.

У некаторых выпадках за лічаныя дні вырашалася тое, што гадамі валакіцілі мясцовыя органы ўлады. Так, за адну ноч у вёсцы Замасточча Віцебскага раёна з'явіўся каладзеж, аб будаўніцтве якога паўгода таму аблвыканкам двойчы даваў справаздачу на паперы — заяўнікам і Адміністрацыі Прэзідэнта.

У адміністрацыю Кастрычніцкага раёна Мінска на прыём звярнуліся тры шматдзетныя сям'і. Два гады таму ім выдзелілі зямельныя ўчасткі для будаўніцтва дамоў у вёсках Цна і Зацень. Аднак, калі пачалося афармленне дакументаў, выявілася, што гэтыя землі раней здадзены ў арэнду іншым грамадзянам, адзін з якіх памёр. Пасля ўмяшання Адміністрацыі Прэзідэнта да адказнасці прыцягнуты старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама і шэраг іншых сталічных чыноўнікаў.

Пасля званка з вёскі Векер Магілёўскага раёна былі ўстаноўлены абуральныя факты абыякавага стаўлення да патрэбаў людзей. Амаль год жыльцы 27 дамоў былі пазбаўлены магчымасці выкарыстоўваць ваду з калодзежаў для піцця. Занальная санслужба яшчэ ў жніўні 2009 года рэкамендавала грамадзянам ужываць прывазную (бутыляваную) ваду, а старшыні Буйніцкага сельвыканкама — адрамантаваць калодзежы. Аднак сітуацыя не была вырашана. Грамадзяне ў знак пратэсту адмовіліся прымаць удзел у выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў 25 красавіка (10 з 19 выбаршчыкаў). Тым не менш гэта не перашкодзіла старшыні сельсавета ўдзельнічаць у выбарах і стаць старшынёй Магілёўскага раённага Савета дэпутатаў. Па выніках першага этапа маніторынгу быў арганізаваны двойчы ў тыдзень падвоз вады для вяскоўцаў, пачалося праектаванне водаправода.

У Гродзенскім райвыканкаме ўстаноўлены выпадак незаконнага выдзялення зямельных участкаў службовым асобам, іх родным і прыбліжаным. У той жа час у спісах на атрыманне зямельных участкаў у райвыканкаме — 593 сям'і, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гродзенскі аблвыканкам быў інфармаваны пракуратурай вобласці аб неабходнасці прыняцця рашэння па гэтым пытанні ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, ад чаго ранейшае кіраўніцтва вобласці самаўстаранілася.

Вострыя праблемы канстатаваны ў будаўніцтве жылля. Найбольш масава на гэты раз заявілі аб сваёй праблеме ашуканыя дольшчыкі. Так, паступіў зварот ад 148 сем'яў з Гродна, якія заключылі з СТАА «Кансент» дагаворы. Грамадзяне аплацілі ў сярэднім 90 працэнтаў кошту кватэр і засталіся без грошай і жылля. Дырэктар СТАА «Кансент», які з'яўляецца адным з яго заснавальнікаў, узяты пад варту. Расійскі заснавальнік СТАА «Кансент» ад вырашэння праблемы поўнасцю самаўстараніўся і пастаянна знаходзіцца ў Расіі. Цяпер запазычанасць па абавязацельствах гэтай арганізацыі складае мільярды рублёў, яе рахункі арыштаваны.

Жыльцы дома № 9 па 2-му зав. Чкалава ў Маладзечне звярталіся ў Камітэт дзяржкантролю са скаргай на тое, што мясцовыя органы ўлады не выконваюць свае абяцанні па капітальным рамонце дома, які пабудаваны ў 1957 годзе. У кастрычніку 2007 года іх дом абяцалі ўключыць у графік рамонту на 2008 год, але за названы тэрмін рамонт не быў праведзены. На паўторны зварот у снежні 2008 года паступіў адказ ад старшыні райвыканкама, што план рамонту на 2009 год сфарміраваны і тэрмін перанесены ўжо на 2010 год. Аднак у адказе на скаргу, накіраваную ў Камітэт дзяржаўнага кантролю, у красавіку 2010 года жыльцам паведамілі, што з-за недастатковага фінансавання рамонт у 2010 годзе не плануецца, і «падаравалі» чарговае абяцанне на 2011 год. Такія непрадуманыя абяцанні, характэрныя для пэўнай катэгорыі службовых асобаў большасці рэгіёнаў, вымушаюць грамадзян гадамі хадзіць па інстанцыях з тамамі перапіскі, а затым з апошняй надзеяй звяртацца да кіраўніка дзяржавы, каб вырашыць праблемы.

Беларусь у час крызісу захавала макраэканамічную стабільнасць і давер людзей

У перыяд глабальнага фінансавага і эканамічнага крызісу ўсе краіны зведалі на сабе яго негатыўнае ўздзеянне. Беларусь таксама не змагла пазбегнуць адмоўнай дынамікі вытворчасці, аднак здолела захаваць макраэканамічную стабільнасць, давер людзей і спакой у грамадстве. Аб гэтым заявіў 19 ліпеня старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль Рубінаў на III Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў у час агульных дэбатаў на тэму «Парламенты ў свеце крызісу: забеспячэнне глабальнай дэмакратычнай падсправаздачнасці і адказнасці ў інтарэсах усеагульнага дабра». Форум праходзіць па 21 ліпеня ў Жэневе, паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі сакратарыята Савета Рэспублікі.

Асаблівая роля ў вырашэнні задач па пераадоленні крызісу лягла на парламентарыяў, адзначыў спікер. Дзякуючы іх намаганням быў прыняты шэраг законаў, накіраваных перш за ўсё на лібералізацыю ўмоў гаспадарання, стымуляванне прадпрымальніцкай ініцыятывы грамадзян і дзяржаўную падтрымку насельніцтва. Пасля прынятых мераў Беларусь па выніках рэйтынгу штогадовай справаздачы Сусветнага банка «Вядзенне бізнэсу» ў 2009 годзе ўзнялася з 82-га на 58-е месца. Як падкрэсліў Анатоль Рубінаў, пастаўлена яшчэ больш важная задача — увайсці па гэтым параметры ў трыццатку першых краін.

Неабходнай умовай захавання стабільнасці ў грамадстве з'яўляецца забеспячэнне ценагара дыялога ўлады з грамадзянамі, падкрэсліў у выступленні кіраўнік верхняй палаты беларускага парламента. Найбольш эфектыўнай формай работы членаў Савета Рэспублікі з насельніцтвам з'яўляецца правядзенне асабістага прыёму грамадзян і разгляд іх зваротаў. Гэта дае магчымасць парламентарыям быць у курсе патрэбнасцяў грамадства, атрымліваць інфармацыю аб стане спраў на месцах, выяўляць актуальныя праблемы і прымаць неабходныя меры для аператыўнага вырашэння пытанняў, якія хвалююць людзей.

Важнейшым складальнікам дзейнасці Савета Рэспублікі як органа тэрытарыяльнага прадстаўніцтва Анатоль Рубінаў назваў узаемадзеянне з рэгіёнамі. Істотную ролю ў гэтым, а таксама ў каардынацыі дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў рознага ўзроўню, паводле яго слоў, адыгрывае Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі. Гэта дзейнасць суправаджаецца шырокай публічнай кампаніяй, анансуецца і асвятляецца ў СМІ. Акрамя таго, сенатары рэгулярна выкарыстоўваюць друк, тэлебачанне і інтэрнэт для інфармавання аб сваёй дзейнасці і планах на будучае, тлумачэнні прымаемых парламентам рашэнняў. Такі механізм узаемадзеяння «Парламент — грамадзянская супольнасць — мясцовая ўлада — урад — СМІ» даў магчымасць стварыць дзейсную працэдуру дыялогу народа і ўлады, забяспечыўшы дакладную сістэмную работу парламентарыяў з насельніцтвам, заснаваную на прынцыпах адказнасці і адкрытасці.

Гаворачы аб дзейнасці нацыянальных парламентаў, Анатоль Рубінаў адзначыў: «Мы не павінны забываць пра адказнасць парламентарыяў перад сусветнай супольнасцю». Прымаючы рашэнні, парламентарыі павінны заўсёды ўлічваць сусветныя тэндэнцыі і сусветны вопыт. У сувязі з гэтым вельмі важным з'яўляецца канструктыўнае супрацоўніцтва парламентаў усіх краін і асаблівая місія ААН у яго развіцці. Сярод апошніх ініцыятыў Беларусі ў ААН спікер згадаў фарміраванне глабальнага партнёрства па барацьбе з гандлем людзьмі, павышэнне даступнасці тэхналогій выкарыстання новых і аднаўляльных крыніц энергіі і інш. На яго думку, міжнароднае парламенцкае супольніцтва павінна паслядоўна выступаць за ўзмацненне ролі ААН у вырашэнні глабальных выклікаў сучаснасці.

Старшыня верхняй палаты парламента Беларусі выказаў упэўненасць у тым, што Міжпарламенцкі саюз, які аб'ядноўвае цяпер парламентарыяў 155 дзяржаў свету, з'яўляецца ўнікальнай пляцоўкай шматбаковага парламенцкага дыялога. Яго дзейнасць і далей павінна быць накіравана на выпрацоўку ўзгодненых падыходаў, якія маглі б забяспечыць мірнае і ўзаемавыгаднае развіццё ўсіх краін і пазбегнуць развіцця крызісных з'яў у свеце.

Беларускі парламент выступае за павышэнне сацыяльнай адказнасці бізнэсу

Галоўным напрамкам заканатворчай дзейнасці парламентаў свету павінна стаць павышэнне сацыяльнай адказнасці бізнэсу. Такую думку выказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка ўчора на 3-й Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў у Жэневе. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў.

«Беларускі парламент лічыць, што вызначальным напрамкам заканатворчай дзейнасці павінна стаць павышэнне адказнасці бізнэсу праз яго больш шырокі ўдзел у забеспячэнні сацыяльнай падтрымкі неабароненых груп насельніцтва, недапушчэнні пагаршэння сітуацыі на рынку працы, справядлівым размеркаванні фінансавых патокаў», — заявіў Уладзімір Андрэйчанка ў час агульных дэбатаў на тэму «Парламенты ў свеце крызісу: забеспячэнне глабальнай дэмакратычнай падсправаздачнасці і адказнасці ў інтарэсах усеагульнай карысці». Ён перакананы, што намаганні заканадаўцаў трэба сфакусіраваць на арганізацыі «незалежнага аналізу стану сацыяльнай сферы для своечасовага прыняцця эфектыўных мераў, якія даюць магчымасць забяспечыць абарону асноўнага права чалавека — права на годнае і сумленнае жыццё».

У якасці прыкладу старшыня Палаты прадстаўнікоў прывёў Беларусь, дзе ў перыяд крызісу былі прыняты рашэнні, нацэленыя на перавод персаналу на няпоўную занятасць замест звальнення. Часткова занятыя грамадзяне атрымалі магчымасць уладкоўвацца на паралельную работу праз цэнтры працаўладкавання з захаваннем ранейшага рабочага месца. Былі ўнесены змяненні ў нарматыўную базу, якія зрабілі больш строгай забарону на дыскрымінацыю пры найманні супрацоўнікаў. Таксама праведзены папраўкі ў заканадаўства, якія замацавалі стапрацэнтныя дзяржаўныя гарантыі банкаўскіх укладаў.

Закранаючы праблематыку глабальнага крызісу, Уладзімір Андрэйчанка сказаў: «Нягледзячы на пэўнае адчуванне аптымізму наконт аднаўлення сусветнай эканомікі, мы пакуль яшчэ далёкія ад канстатацыі ўстойлівай тэндэнцыі да яе аздараўлення». На яго думку, будучыня немагчыма без карэннага перагляду існуючай эканамічнай сістэмы і дзяржаўнай палітыкі ў цэлым. «Нам патрэбна такая эканоміка і такая палітыка, дзе ў аснову будуць пакладзены не вяршэнства «права грошай» на шкоду астатнім членам грамадства, а дэмакратычныя прынцыпы маральнасці і ўзаемнай павагі для кожнага», — падкрэсліў спікер.

Ён перакананы, што прычыны ўзнікнення сусветнага крызісу «нельга назваць аб'ектыўнымі». У першую чаргу ён адбыўся з-за пагарджання сацыяльнай і грамадзянскай адказнасці з боку буйнога бізнэсу, прадстаўнікі якога захапіліся нястрымнай гонкай за абагачэннем без уліку магчымых вынікаў. Уладзімір Андрэйчанка асабліва падкрэсліў парадаксальны факт: у глабальным маштабе пры прыняцці антыкрызісных мераў «ільвіная доля рэсурсаў была кінута на падтрымку тых самых карпарацый, чыя сквапнасць стала віной існуючай сітуацыі, а дапамога ж звычайным людзям, перад многімі з якіх востра паўстала пытанне выжывання, вымяралася значна больш скромнымі сумамі».

РАСПРАЦАВАНЫ ПРАЕКТ НОВАЙ ПРАГРАМЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першы ўключае ў сябе шэраг захадаў па сацыяльнай абароне, медыцынскім забеспячэнні, санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні пацярпелых. У прыватнасці, мяркуецца палепшыць медыцынскае абслугоўванне, павысіць эфектыўнасць і якасць санаторна-курортнага лячэння, а таксама прыцягнуць на забруджаныя тэрыторыі высакаякасных спецыялістаў і кампенсаваць транспартныя расходы арганізацый гандлю на дастаўку прадукцыі ў забруджаныя раёны. Каб выканаць задуманае, у найбліжэйшыя пяць гадоў спатрэбіцца 3 трыльёны 21 мільярд рублёў, у тым ліку звыш 2,7 трыльёна з рэспубліканскага бюджэту.

Мерапрыемствы другога напрамку закліканыя забяспечыць радыяцыйную абарону насельніцтва і тэрыторый. Тут прыярытэтным стане рэалізацыя комплексу абаронных захадаў у сельскай гаспадарцы, што дазволіць забяспечыць стабільную вытворчасць прадукцыі, якая будзе адпавядаць рэспубліканскім і міжнародным нарматывам па ўтрыманні радыенуклідаў. На рэалізацыю захадаў па гэтым напрамку неабходна 865,9 мільярда рублёў.

У асобную групу выдзеленыя захады па сацыяльна-эканамічным развіцці пацярпелых рэгіёнаў. Яны накіраваныя на павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. Пералічваючы запланаванае па гэтым напрамку, міністр, у прыватнасці, згадаў газіфікацыю, водазабеспячэнне, добраўпарадкаванне населеных пунктаў і будаўніцтва жылля для льготнай катэгорыі грамадзян. На гэтыя мэты спатрэбіцца каля 2,1 мільярда рублёў. Што ж датычыцца чацвёртага напрамку, то ён закранае навуковае суправаджэнне і інфармацыйную палітыку. Паводле слоў міністра, неабходна выхоўваць радыелагічную адукаванасць грамадзян і фарміраваць адэкватныя адносіны да забруджаных тэрыторый з боку як нашага насельніцтва, так і сусветнай супольнасці. Сродкі, якія мяркуецца выдаткаваць па гэтым напрамку, складуць каля 72 мільярдаў рублёў. Падсумоўваючы агульны аб'ём фінансавых сродкаў, якія спатрэбяцца на рэалізацыю мерапрыемстваў новай праграмы, Энвер Барыеў агучыў лічбу ў 6,6 трыльёна рублёў, у тым ліку амаль 270 мільярдаў будзе выдаткавана з мясцовых бюджэтаў. Ён таксама зазначыў, што пры фарміраванні аб'ёмаў фінансавання мерапрыемстваў праграмы былі ўлічаныя магчымасці эканомікі краіны, а таксама прадугледжана прыцягванне сродкаў мясцовых бюджэтаў і іншых крыніц фінансавання — уласных сродкаў прадпрыемстваў, пазыковых сродкаў, уключаючы замежныя інвестыцыі, сродкі іншых дзяржаўных і галіновых праграм.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Калектыў Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы смуткуе ў сувязі са смерцю былога начальніка ўпраўлення кадраў Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь палкоўніка ў адстаўцы НЕСЦЕРАВА Уладзіміра Дзмітрыевіча і выказвае глыбокае спачуванне сям'і і блізкім нябожчыка.

Кожны, хто з ім працаваў, у каго ён быў настаўнікам, назаўсёды захавае ў сабе вобраз гэтага цудоўнага чалавека, чалавека вялікай душы, сапраўднага сябра і таварыша.

ПРАКАЦІЎСЯ СУДЗІМЫ БЕЗ ДАКУМЕНТАЎ...

Жыхару Калінкавічаў, які адбываў пакаранне ў Веткаўскай калоніі-пасяленні і не меў пасведчання на права кіравання, даверыў сваё аўто «Меркурый-кутар» сябар з Мінска. Бліжэй да вечара на аўтадарозе Гомель—Ветка ля паварота на вёску Прысна грамадзянін запар сутыкнуўся з трыма транспартнымі сродкамі ў папутным кірунку: «Аудзі», «Рэно», матацыклам «Хонда». У выніку віноўнік і яго сябар загінулі на месцы аварыі, паранена жонка гаспадара машыны, якая сядзела на заднім сядзенні, і 11-гадовы хлопчык — пасажыр «Рэно».

За выхадныя на Гомельшчыне адбылося 57 дарожна-транспартных здарэнняў, у іх загінулі 4 чалавекі і 18 параненыя.

Адмоўна на стан за рулём уплывае спякота, таму ў прэс-службе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама заклікаюць паездкі на машыне рабіць у час, калі яна крыху спадае, — раніцай і ўвечары.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Надзённае

ЯК ДОЎГА ПРАЦЯГНЕЦЦА ПАТАННЕННЕ АЎТАМАБІЛЯЎ?

Кошты на машыны імкнуцца ўніз, а запчасткі хутка падаражэюць

Журналіст «Звязды» даведаўся пра самыя апошнія тэндэнцыі на аўтарынку

Як не памыліцца, не пераплаціць пры набыцці машыны? Якія кошты на папулярныя мадэлі сёння можна лічыць адэкватнымі? Пра ўсё гэта чытайце ў нашым даследаванні.

Падобна на тое, што кошты на рынку бэкашных аўто хутка дасягнуць рэкорднага мінімуму.

Эксперты падлічваюць падзенні цэнаў у працэнтах. Так, **старшыня Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі Сяргей МІХНЕВІЧ** адзначае, што за два апошнія месяцы аўтамабілі ў сярэднім згубілі каля 15% ад сваіх былых рынкавых коштаў. І тэндэнцыя да зніжэння працягваецца.

Вядомы **аўтаэксперт Анатоль ШАЎЧЭНКА, галоўны рэдактар газеты «Аўтадайжэст»**, зазначае, што аўтарынак «лёг»:

— Прапанова перавышае попыт, машыны амаль ніхто не купляе. Патанненне аўтамабіляў будзе працягвацца да канца лета, а то і да канца года.

Падзенне коштаў відавочнае, вочы з цяжкасцю вераць асобным фактам. Напрыклад, у маім гаражным кааператыве стаіць белы «Опель Астра» 2002 года з аб'ёмам рухавіка 2000 см³. Па-суседску ведаю, што аўтамабіль у нармальным стане. Яшчэ месяц таму на машыне вісела аб'ява «Прадам. 6050 у.а.» Два тыдні таму ўладальнік змяніў аб'яву на «Прадам тэрмінова, 4950 у.а.». Машына як стаяла, так і стаіць.

На папулярным народным аўтарынку «Ждановічы», куды прыязджаюць гандляры з усёй Беларусі, такое ж коштавае падзенне. І нягледзячы на гэта — толькі маленькая купка пакупнікоў.

— Некаторыя людзі прадавалі зямлю, дачы, кватэры. Купілі тузін машын, спадзяваліся ў Расію прадаць. Але межы не адкрылі, і ўсё ляснулася, — з сумнай усмешкай распавядае аўтаперагоншчык Максім. *— Па рынку чуткі ходзяць, што адзін з такіх мясцовых «бізнэсменаў» у псіхушку трапіў. А што вы хочаце? Аддаём машыны амаль па сабекошце.*

Максім прапанаваў набыць яго «Рэно Лагуну» 2002 года (дызельны рухавік аб'ёмам 1900 см³) за 5500 долараў ЗША. Яшчэ ўзімку такая машына каштавала прыкладна 7700 долараў. Бензінавую «Лагуну» такога ж года сёння можна ўзяць за 5000 долараў.

— Кажуць, з восені кошты ўверх папаўзуць, калі рынак нармалізуецца, — з надзеяй у голасе перагаварваліся гандляры ля чорнай «Аўдзі». *— Саня Шайба (аўтаперагоншчык, які працуе на «Ждановічах» — **«Звязда»**) вунь увогуле машыны не выганяе на рынак, чакае, пакуль скончыцца лета.*

УВАГА!

Кошты на аўтазапчасткі павялічацца

Прэса пра гэта пакуль не паведамляла, а вось гандляры аўтакрамаў з імпэтам абмяркоўваюць пытанне.

— Чаму аўтазапчасткі будуць каштаваць даражэй? Гэта відавочная ісціна, — тлумачыць эканамічныя механізмы **Алег ШАЎРУК, уладальнік кропкі з запчасткамі на рынку «Ждановічы»**. *— У краіну прыгналі багата машын, нашмат болей, чым звычайна. Пакуль што яны ездзяць, але хутка пачнуць ламацца. Попыт на запчасткі істотна павялічыцца. Чаму б мне на гэтым не зарабіць? Мы ўжо рыхтуемся павялічыць кошты на 10 %. Да таго ж цэны залежаць ад еўра. Улетку вартасць валюты знізілася. І калі еўра пачне расці — кошты зноў-такі пачнуць павялічвацца. Таму рыхтуйцеся.*

ГАЛОЎНАЕ ПРАВІЛА — НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ АДДАВАЦЬ ГРОШЫ!

Калі вы той самы рэдкі прадбачлівы «партызан», які сядзеў у кустах і чакаў неверагоднага патанненя аўто (у асноўным людзі ўжо набылі аўтамабілі і не маюць грошай на чарговую замену), то памятайце залатое правіла — не спяшайцеся!

Сітуацыя на рынку дазваляе выбіраць машыну педантычна і з халоднай галавой.

На «Ждановічах» пабачыў дагледжаны «Фальксваген Пасат» 2002 года за 9600 (бензінавы рухавік 1800 см3).

— Гарантую, што гэта машына тут доўга не прастаіць, заўтра ж схопяць, — пабажыўся гандляр і працягнуў сваю візітоўку «Аўтамабілі са Швейцарыі».

І што вы думаеце? Так распісаў свой «Пасат», што, каб былі ў мяне грошы, кінуўся б яго купляць. Не аўтагандляр, а Кашпіроўскі нейкі.

Прайшоў літаральна 500 метраў і бачу «Фальксваген Пасат» 2003 года (з дызельным рухавіком 1900 см³) за... 7950 долараў ЗША. У параўнанні з мінулай машынай гэтая на год маладзейшая, з лепшым рухавіком ды яшчэ і таннейшая на 1650 баксаў!

— Я сам з Капыля, учора выставіў «Пасат» за 8300 долараў, але дадому трэба, грошы патрэбныя. Таму і збіў цану, — патлумачыў гандляр.



Журналіст «Звязды» вырашыў набыць неабходныя запчасткі для сваёй машыны да іх падаражэння.

Вось якія вялікія разбежкі коштаў!

У такой сітуацыі ёсць надзейная стратэгія выжывання — дасканала вывучаць усе прапановы і не спяшацца, правяраць кожную дэталь машыны на СТА. Крытычная сітуацыя на аўтарынку толькі спрыяе такім паводзінам.

Самы надзейны варыянт, зразумела, купіць новую машыну ў аўтасалоне. Гады тры ўвогуле не будзе ламацца. Але мытныя пошліны для юрыдычных асобаў былі істотна павялічаныя. У выніку продаж машын у аўтасалонах скараціўся як мінімум на 30%, а цэны выраслі.

АНАЛІЗ КОШТАЎ НА АЎТАРЫНКУ

Журналіст «Звязды» абышоў аўтарынкі, перачытаў аб'явы ў рэкламных газетах, «прапыласосіў» інтэрнэт. Дэталёва вывучыў сітуацыю: якія кошты можна назваць адэкватнымі, якія — завышанымі.

Такім чынам, мы склалі табліцу з цэнамі на папулярныя ў народзе легкавікі.

Аднак перад тым, як яе прагледзець, улічыце два важныя моманты:

1) Высветлілася, што падзенне коштаў амаль не закранула так званыя гарадскія аўтамабілі (у народзе іх называюць малалітражкі, жаночыя машынкі). Прычына — невялікі попыт на такі тавар.

2) Улічыце, што пазначаны кошт можна збіць на 200-300 долараў ЗША. Так на аўтарынку прынята.

Яўген ВАЛОШЫН.

Катэгорыя	Марка, год выпуску	Фота	Рухавік	Адэкватныя кошты (у долараў)	Асаблівасці
Гарадское аўто	**«Таёта Ярыс»**, 2002.		1000 см³, бензін	**ад 4600** (чырвонага колеру) **да 5350**	**Кошты застаюцца на стабільным узроўні, нягледзячы на сітуацыю з мытнымі пошлінамі.**
	«Рэно Кліа», 2003.		1500 см³, дызель	**ад 4700** (белага колеру) **да 5500**	
Гольф-клас	**«Опель Астра»**, 2002.		1700 см³, дызель	**ад 5450** у поўнай камплектацыі	
	«Пежо 307 SW», 2006.		1600 см³, дызель	**ад 8800** (белы колер) **да 9700**	
Кампактвэн	**«Сітраэн Пікаса»**, 2003.		1800 см³, бензін	**ад 5600** (чалавек прадае машыну тэрмінова) **да 6500**	**Кошты пайшлі на зніжэнне з-за вялікай колькасці прыгнаных аўто.**
Сярэдні клас	**«Фальксваген Пасат»**, 2003.		1900 см³, дызель	**ад 7950** (чалавек прадаваў аўто тэрмінова, знізіў кошт максімальна) **да 8500**	
SUV (у народзе яшчэ называюць джыпам)	**«Нісан Х-Трэйл»**, 2001.			**ад 9350**	
Люкс	**«Аўдзі А8»**, 2000.		3700 см³, бензін	**ад 11600**	

Абзац

Попыт на марозіва і безалкагольныя напоі ў Беларусі з надыходам гарачыні ўзрос у 4,5 раза.

Навальніца стала прычынай пажару ў Бешанковіцкім раёне. Лецішча ў вёсцы Сіняны загарэлася ад удару маланкі. Відавочцамі здарэння сталі супрацоўнікі падраздзялення раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, якія дзяжурылі недалёка ў полі на жніве. Убачыўшы дым, выратавальнікі паведамілі пра ўзгаранне дыспетчару райаддзела і выехалі на тушэнне. Пажар быў ліквідаваны.

Двое дзяцей пацярпелі за адны суткі ў ідэнтычных ДТЗ у Гродзенскай вобласці. Аднолькавыя аварыі адбыліся ў Карэліцкім і Шчучынскім раёнах. На закругленнях дарог машыны з'ехалі ў кюветы і перакуліліся. Абодва ДТЗ мелі месца ў светлы час сутак. На кожным з закругленняў усталяваны знак «Небяспечны паварот». Відаць, кіроўцы не ўлічылі гэтага і не знізілі хуткасці. У выніку дзве дзяўчынкі — 2003 і 2004 гадоў нараджэння — атрымалі пераломы.

Труп са звязанымі рукамі і нагамі вылавілі ў рацэ Пціч Петрыкаўскага раёна. Міліцыя шукае зламыснікаў, якія забілі мужчыну і выкінулі яго ў раку. Экспертыза ўстанавіла, што смерць наступіла ў выніку чэрапна-мазгавой траўмы. Заведзена крымінальная справа.

Палачанін скраў два грузавыя аўтамабілі агульным коштам Br193,5 млн. Займаючы пасаду кіраўніка фірмы, ён арандаваў на год у адной з камерцыйных структураў горада грузавыя машыны Mercedes-Benz і DAF. Праз 3 месяцы ён перастаў плаціць за арэнду транспарту. Спробы знайсці нядобрасумленнага кліента і вярнуць фуры поспеху не мелі, што змусіла арэндадаўцу звярнуцца ў праваахоўныя органы. Заведзена крымінальная справа.

Поўны абзац

У Вялікабрытаніі пачнуць прадаваць марозіва, створанае спецыяльна для сабак. Яно адрозніваецца ад звычайнага па смакавых якасцях і тэкстуры. Сабакам прапануюць марозіва са смакам кумпяка і курыцы, упрыгожанае хрумсткай бісквітнай скарыначкай. Кошт адной порцыі ласунку не ўдкладняецца. Нядаўна пра запуск вытворчасці спецыяльнага соевага марозіва для сабак заявілі і ў Бельгіі. У пачатку гэтага месяца ў тамтэйшых крамах з'явіўся спецыяльны халодны дэсерт для сабак. Кошт упакоўкі, куды ўваходзяць 6 порцый марозіва, складае каля 5 еўра.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Калі машыны зноўку пачнуць даражэць?

Прадказаць гэта дакладна амаль немагчыма.

Падаражэнні на аўтарынку залежаць ад некалькіх чыннікаў:

Першы: павелічэнне мытных пошлін на ўвоз машын для фізічных асобаў з 2011 года. Чым бліжэй да гэтай даты, тым болей аўтагандляры будуць падвышаць кошты.

Але ў сувязі з тым, што палітыкі не могуць дамовіцца наконт супольнай мытнай прасторы, павелічэнне пошлін з 2011 года сёння выглядае малаверагодным. Хоць сітуацыя можа змяніцца ў любы момант. Беларусы ўжо навучаныя тым, што чыноўнікі часам прымаюць самыя нечаканыя рашэнні.

Другі: калі сітуацыя на аўтарынку нармалізуецца (а гэта неадступна здарыцца), кошты зноўку пачнуць павышацца. Агромістая колькасць увезеных у Беларусь легкавікоў усё адно разыдзецца, і тады суадносіны попыту і прапановы запрацуюць па-ранейшаму.

Эксперты адзначаюць, што, хутчэй за ўсё, сітуацыя на аўтарынку нармалізуецца з пачатку новага года. А кошты, хутчэй за ўсё, пачнуць павышацца з вясны 2011-га.

Падрабязнасці

Андрэй ТУР:

Дырэктыва № 4 — гэта не канец лібералізацыі, а толькі чарговы крок

ПРАЕКТ Дырэктывы № 4 наконт далейшай лібералізацыі эканомікі абмеркавалі беларускія бізнэсмены на пасяджэнні Рэспубліканскага клуба дырэктараў, арганізаванага Бізнэс-саюзам прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага. Яшчэ ў красавіку 2010 года ў сваім пасланні Парламенту і беларускаму народу Прэзідэнт Беларусі выказаў меркаванне, што наспела неабходнасць прыняцця Дырэктывы №4 аб далейшай лібералізацыі эканомікі Беларусі, накіраванай на разнявольванне прадпрымальніцкай ініцыятывы. Зараз Міністэрства эканомікі займаецца падрыхтоўкай праекта дырэктывы, і Андрэй ТУР, намеснік міністра эканомікі, паспрабаваў патлумачыць удзельнікам пасяджэння, якім будзе гэты дакумент на выхадзе.

Фота БЕЛТА.

— Лібералізацыя — гэта не нейкая часовая кампанія, а пэўныя змены ў вектары эканамічнай палітыкі, звязаныя са стымуляваннем і разнявольваннем бізнэсу, — сказаў Андрэй Тур і дадаў, што маецца на ўвазе не толькі малы і сярэдні бізнэс, а ўсе бакі эканамічнай сітстэмы.

Андрэй Тур нагадаў прадпрымальнікам, што актыўнае прасоўванне ў накірунку лібералізацыі пачалося з 2007 года, і ўзгадаў ужо зробленыя з таго часу некаторыя змены:

— Мы вельмі доўга прабівалі сістэму рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання па заяўляльным прынцыпе. А зараз мы паглядзелі, што з таго моманту — гэта год з нечым — у нас колькасць суб'ектаў гаспадарання павялічылася прыкладна на 40%. Што тычыцца падаткаабкладання і прыняцця Асаблівай часткі падатковага кодэксу, то, па нашых разліках, агульны падатковы ціск у дачыненні да прыбытку арганізацый павінен скараціцца да 60%, а часовыя затраты — да 300 гадзін, — сказаў Андрэй Тур. — На сёння спрошчаная сістэма доступу аб'ектаў малога прадпрымальніцтва да фінансавых рэсурсаў, хоць сродкі, якія выдаткоўваюцца, не вельмі значныя. Нашы банкіры лічаць сябе вельмі прасунутымі і сучаснымі, але сама банкаўская сістэма аказалася не гатовая да сапраўды ліберальных умоў крэдытавання, асабліва суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. І зараз стаіць пытанне наконт таго, каб пайсці на дастаткова значныя змены ў нарматыўнай базе, якая абмяжоўвае магчымасць стварэння нябанкаўскіх фінансавых інстытутаў.

Таксама намеснік міністра эканомікі нагадаў, што за апошні час быў пашыраны спіс відаў рамесных дзейнасці, была спроба ўрэгуляваць арэндныя адносіны 518-м указам, дазволены перавод жылых памяшканняў на першых паверхах дамоў у нежылыя, дадзены падатковыя льготы прадпрымальніцтву ў малых і сярэдніх гарадах, створаны ўмовы для экспарту беларускай прадукцыі, урэгуляваная кантрольна-наглядная дзейнасць і інш. Дарэчы, наконт праверачнай дзейнасці Андрэй Тур выказаў меркаванне, што яна «павінна насіць не фіскальна-забаронча характар, а стымулюючы, бо любы кантроль — гэта выяўленне сістэмных памылак, іх структураванне і выхад на тое, каб такіх памылак болей не было».

Закрануў у сваім выступленні Андрэй Мікалаевіч і тэму ўпарадкавання ліцэнзавання асобных відаў дзейнасці — праект адпаведнага Указа ўжо доўгі час ходзіць паміж дзяржустановамі:

— На жаль, праца над гэтым указам зацягнулася. Як вы разумееце, шмат у нас апанентаў, і ніхто не хоча аддаваць такі інструмент як ліцэнзаванне. Хоць мы спрабуем патлумачыць нашым калегам, што часам за кошт сертыфікацыі і стандартызацыі рэгуляванне можа быць яшчэ болей жорсткае, чым ліцэнзаванне. Аднак ліцэнзаванне — зразумелая мера, міністэрства ў гэтым плане ні за што не адказвае і не распрацоўвае адпаведныя стандарты. Але калі мы рэалізуем задуманае, то з 51 віду ліцэнзуемай дзейнасці прапануем адмяніць 16. Акрамя таго, мяркуецца адмяніць больш за 60 пазіцый з астатніх відаў дзейнасці, што застаюцца. Ну і вядома, мы прагназуем, што толькі за кошт адмены ліцэнзавання рознічнага гандлю (за выключэннем гандлю падакцызнымі таварамі), колькасць ліцэнзій, якія выдаюцца, скараціцца на 60%, — не губляе аптымізму наконт бліжэйшага прыняцця ўказа аб ліцэнзаванні Андрэй Тур.

Ен жа паведаміў: у рамках далейшай лібералізацыі будзе правадзіцца праца наконт прыватызацыі, прыцягнення інвестыцый (у першую чаргу — накіраваных на скарачэнне спажывання энергетычных рэсурсаў), забеспячэння гарантый аховы правоў уласнасці, працягу працы па лібералізацыі цэнаўтварэння, стабільнасці заканадаўства, развіцця субкантрактацыі і гэтак далей.

— Нават з прыняццем дырэктывы, з прыняццем плана мерапрыемстваў па яе рэалізацыі, я ўпэўнены, што праца па лібералізацыі эканамічных адносінаў, стымуляванні прадпрымальніцкай ініцыятывы не скончыцца. Дырэктыва — гэта чарговы, вельмі глыбокі крок, але не канчатковы момант у рэалізацыі стратэгіі лібералізацыі, — падкрэсліў Андрэй Тур.

Адказваючы на пытанні бізнэсменаў наконт таго, ці будуць тыя ці іншыя пытанні паляпшэння дзелавога асяродку ўключаныя ў тэкст чацвёртай дырэктывы, Андрэй Мікалаевіч адзначыў, што гэта перш за ўсё — палітычны дакумент:

— Дырэктыва яшчэ распрацоўваецца, уносьце свае прапановы. Але я хачу падкрэсліць наступны момант: калі дырэктыва будзе закранаць важныя, але прыватныя пытанні, то яна пераўтворыцца з палітычнага дакумента ў нацыянальную платформу бізнэсу. Платформа ўжо ёсць, хай яна дзейнічае, а дырэктыва — гэта палітычны дакумент. І калі мы там пачнём прапісваць усе рэчы, усе канкрэтныя прапановы, то яна з патрэбных 2-3 старонак ператворыцца ў 12-старонкавую, потым — у яшчэ большую. І тады яна згубіць свой палітычны сэнс. Праца ідзе, давайце свае прапановы, будзем іх разглядаць і спрачацца, але я хачу, каб вы разумелі месца такога дакумента, — сказаў Андрэй Тур і дадаў, што ў дырэктыве будзе ісці гаворка ў цэлым пра стымуляванне прадпрымальніцва, а не яго асобных відаў: — Канкрэтныя прыярытэты мы расставім у праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця — перш за ўсё гаворка ідзе пра інавацыйнае развіццё, па-другое, пра стымуляванне інвестыцый, па-трэцяе, пра экспарт. Я лічу, што ў дырэктыве распісваць гэтыя моманты не варта, бо гэта дакумент палітычны.

Разам з тым удзельнікі пасяджэння Рэспубліканскага клуба дырэктараў звярнулі ўвагу на важнасць перш за ўсё пытанняў наконт уласнасці:

— З уласнасці, роўнасці формаў уласнасці, забеспячэнне аховы — менавіта з гэтага трэба пачынаць, — лічыць **Валерый ФАДЗЕЕЎ, дарадца Міжнароднай фінансавай карпарацыі.** — Можа, у гэтай галіне і не трэба нічога новага прыдумляць, а проста адмяніць тыя нарматыўныя акты, якія абмяжоўваюць права ўласнасці. Тут сапраўды патрэбна палітычная воля дзяржавы, якая б сказала — «не смейце чапаць прыватную ўласнасць!», акрамя тых выпадкаў, калі сапраўды трэба ўмяшацца. І, на мой погляд, вельмі важна, што ў праекце дырэктывы дзяржава адмаўляецца ад сваёй патэрналісцкай ролі, калі яна ўсё рэгулюе і сама ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць. Я ўвесь час узгадваю словы аднаго нямецкага прафесара, які вучыў нас у 1993 годзе: «Дзяржава вельмі дрэнны прадпрымальнік» — такімі словамі ён пачынаў кожную лекцыю, — падзяліўся думкамі Валеры Фадзееў.

Таксама ў прадпрымальніцкай супольнасці ўзніклі пытанні, калі ж нарэшце вельмі чаканая дзелавымі коламі чацвёртая дырэктыва будзе прынятая. Андрэй Тур канкрэтнай даты не агучыў, але адзначыў, што «ў нас тэрмін — 1 верасня».

Павел БЕРАСНЕЎ.

У МІНСКУ РАСПАЧАЛАСЯ ВАЙНА... МОКРАЯ

З учарашняга дня ў Мінску абвешчана «ваеннае становішча». У сталіцы пачынаецца гульня «Мокрыя войны». На працягу некалькіх дзён удзельнікі будуць паляваць на сваіх ахвяраў.

Не хвалюйцеся, калі раптам каля вас з'явіцца чалавек з водным пісталетам і расстраляе вашага суседа вадой. Гэта не злы жарт. Гульня «Мокрыя войны» афіцыйна распачалася ў сталіцы з панядзелка.

Сэнс «Мокрых войнаў» у тым, каб «упаляваць» як мага большую колькасць чалавек, абліўшы іх вадой з воднай зброі (па правілах вада павінна быць толькі чыстай). Зброяй можа з'яўляцца водны пісталет, бутэлька, пакет з вадой — карацей, усё, што ёсць пад рукой. Перад пачаткам гульні ўсе ахвотныя рэгіструюцца на спецыяльным сайце. Там пакідаюць свае кантактныя звесткі, фотаздымкі і апісваюць, дзе яны бываюць і г.д. Пасля кожны атрымлівае дасье на сваю ахвяру: месцы частага наведвання, фотаздымак і г.д.

Кожны з удзельнікаў адначасова з'яўляецца і ахвярай, і паляўнічым. Калі вас удалося злавіць, то вы павінны аддаць дасье вашай ахвяры. І ваш паляўнічы цяпер палюе на яе. Такім чынам выйграе той, хто ў выніку «замочыць» большую колькасць удзельнікаў.

Адным з новых правілаў мінскай гульні стала ўмова не «забіваць» ахвяру на працы. Прычына — не ўсе працадаўцы адэкватна ўспрымаюць такія гульні сваіх працаўнікоў.

У нядзелю адбыліся масавыя «Мокрыя войны» перад фантанам на Нямізе.

— Войны прайшлі па спрошчаных правілах, — расказвае адна з арганізатараў гульні Ірына Куракіна. — Не трэба было рэгістравацца на сайце, неабходна была толькі вадзяная зброя і чыстая вада. Правілы — усе мочаць усіх. Мэта — выйсці сухім з вады. Увогуле «Мокрыя войны» не маюць ні палітычных, ні рэлігійных мэтаў. Задача гульні — хоць бы на хвіліну адцягнуць людзей ад штодзённай руціны і парадавацца спякотнаму лету ў сталіцы.

Першыя «Мокрыя войны» прайшлі ў сталіцы ў сакавіку 2008 года пры падтрымцы сайта актыўных гарадскіх гульняў Encounter. Гэты год і стаў пачаткам адліку гісторыі «Мокрых войнаў» менавіта ў такім фармаце. З таго часу ўжо прайшло болей за 450 гульняў у гарадах Беларусі, Расіі, Украіны, Эстоніі, Літвы, Латвіі, Францыі і іншых краін.

Настасся ЗАНЬКО.
Фота Хрысціны КРЫШТАЛІК.

У «Мокрых войнах» ля Нямігі змагалася некалькі сотняў чалавек.

На Грыўдзе і Шчары патанулі хлопцы

У адзін дзень на рэчках Грыўда і Шчара Слонімскага раёна патанулі юнакі. Падчас купання ў рэчцы Грыўда недалёка ад вёскі Новадзявяткавічы з вады не здолеў выбрацца 27-гадовы Павел Г. У гэты самы дзень ноччу патануў на Шчары і слонімец Дзмітрый В., якому было 30 гадоў. Целы тапельцаў даставілі. Вядзецца праверка.

Сяргей ЧЫГРЫН.

Дзякуй!

Сярод добрых людзей

...Таго, што давялося перажыць мне, не пажадаю нават ворагам: пяць месяцаў у бальніцы, 18 дзён у рэанімацыі — паміж жыццём і смерцю.

Выпадак, як кажуць, быў безнадзейным — шанцаў на жыццё лічы што ніякіх, да абласной бальніцы, дзе для такіх вось цяжкахворых, можа, і лепшае абсталяванне, мяне проста не давезлі б...

І тады загадчык хірургічнага аддзялення нашай раённай бальніцы **Дзмітрый Аляксандравіч САФАР** удвух з хірургам **Сяргеем Васільевічам КРАЎЧАНКАМ** рашылі аперыраваць самі — яны «чаравалі» нада мной шэсць гадзін. І потым тры дні, тры ночы, лічы, не адыходзілі — дзяжурылі ля ложка разам з урачамі аддзялення рэанімацыі...

Кранала і ўвага медсясцёр, санітарак. Тыя, што працуюць у хірургічным аддзяленні, прыходзілі праведваць мяне ў рэанімацыі і наадварот... Яны заўсёды пыталіся пра самаадчуванне, заўсёды падбадзёрвалі, нечым частавалі.

На працягу гэтых пяці месяцаў побач былі і мае супрацоўнікі — паштальёны Лучынскага аддзялення сувязі Галіна Яфрэмаўна Каморнікава і Алена Іванаўна Лебедзева, начальнік Рагачоўскага вузла паштовай сувязі Святлана Мікалаеўна Зайцава. Я, безумоўна ж, ведала, што яна — і чалавек, і кіраўнік, якіх пашукаць, але ж цяпер пераканалася ў гэтым сама: не раз, нягледзячы на занятасць, Святлана Мікалаеўна прыходзіла да мяне ў бальніцу, не раз наведвала і старшы інструктар Таццяна Ільінічна Жураўлёва, многія іншыя. Яны прыносілі розныя пачастункі (хоць, шчыра кажучы, было і не да іх...), сачылі, каб не скончыліся грошы на мабільным тэлефоне, пастаянна былі на сувязі...

Вось так агульнымі намаганнямі пяць месяцаў мяне цягнулі з таго свету. І выцягнулі!

Таму цяпер, крыху ачомаўшыся, хачу нізка пакланіцца ўсім сваім выратавальнікам — медыцынскаму персаналу аддзяленняў хірургіі і рэанімацыі Рагачоўскай раённай бальніцы, калектыву паштавікоў — пажадаць, каб і самі яны, і ўсе іх блізкія заўсёды былі жывымі і здаровымі. А яшчэ — каб заўсёды заставаліся людзьмі — сапраўднымі і добрымі, сярод якіх лягчэ.

Л.М. СЯМЁНАВА, начальнік аддзялення сувязі,
в. Лучын, Рагачоўскі раён.

ПАЙШОЎ У ЛЕС І НЕ ВЯРНУЎСЯ

Са сваёй дачы, якая знаходзіцца каля в. Дзеткавічы ў Баранавіцкім раёне, 81-гадовы пенсіянер пайшоў у ягады і заблукаў.

Пасля таго, як дзед не вярнуўся дамоў, радня захвалявалася. Сваякі, міліцыя і ваенныя больш за тыдзень шукалі пенсіянера, але, прачасаўшы навакольныя лясы, яго не знайшлі. А на нябараку выпадкова выйшаў жыхар Слонімскага раёна, які збіраў ягады. Пенсіянер быў мёртвы. Прычына смерці высвятляецца.

ПАД КОЛАМІ ГРУЗАВІКА ЗАГІНУЛА ДЗІЦЯ

На тэрыторыі адной вытворчай майстэрні ў Пружанах здарылася трагедыя.

Вадзіцель рабіў разварот на грузавой машыне і, відавочна, забыў пра свайго 9-гадовага сына, які знаходзіўся каля аўтамабіля. Хлопчык трапіў пад колы і загінуў на месцы. Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Открытое акционерное общество «Могилевский завод искусственного волокна» проводит открытый аукцион по продаже неиспользуемого оборудования

Аукцион состоится 24 августа 2010 года в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Продавец и организатор аукциона: ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, контактный т./ф. (8 0222) 29 75 13.

№ лота	Наименование	Год выпуска	Стартовая цена с НДС, руб.	Сумма задатка, руб.
1	Диван-кровать	2008	2 840 000	284 000
2	Кровать «Лика»	2008	1 278 400	127 840
3	Матрац «Тифани»	2008	1 038 000	103 800
4	Каркас кроватный	2008	162 600	16 260

Объекты расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Заявителю для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задатки перечисляются **не позднее 23 августа 2010 года** на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491015 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк» код 202, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 9 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, ОАО «Могилевский ЗИВ», каб. 315.

Последний день подачи заявок: **23 августа 2010 года до 17.00**. Заключительная регистрация участников аукциона **состоится 23 августа 2010 года с 13.30 до 14.00** в зале заседания ОАО «Могилевский ЗИВ».

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами аукциона.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов не позднее 3-х дней до его проведения, о чем извещаются участники.

Срок заключения договора – не позднее 15 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Задаток засчитывается в счет оплаты приобретенного объекта. Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней, после проведения торгов, возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона.

Открытое акционерное общество «Чернавчицкий завод ЖБИ» приобретает на баланс Общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ», в количестве до 3340 штук по цене 45040 белорусских рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью дальнейшей продажи инвесторам. Выкуп простых (обыкновенных) акций будет производиться в период с 26.07.2010 г. по 20.08.2010 г. с оформлением сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям.

Оплата приобретенных Обществом акций будет производиться не позднее 60 (Шестидесяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи. Форма оплаты наличными денежными средствами или путем безналичного расчета. Срок, в течение которого акционеры должны предоставить предложение о продаже принадлежащих им акций, – с 21.07.2010 г. по 23.07.2010 года. Срок, в течение которого осуществляется совершение сделок купли-продажи акций, – с 26.07.2010 г. по 20.08.2010 года. Сделки заключаются по адресу: 225030, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г, Брестский район. Конт. тел. 8 0162 94 57 66.

УНП 200034706.

Утерянную печать ЧТУП «Дизастер» считать недействительной.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 27 августа 2010 года проводит 13-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
96.	Автотопливомаслозаправщик АТМЗ-4,5-375, с/о № 821216 на а/шасси УРАЛ-375 ш. 390155 дв. 784793, 4 кат.	н.п. Михановичи в/часть 52188	1982	5766	15 000 000	1 500 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00 **27 августа 2010 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **25 августа 2010 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **27 августа 2010 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел. (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объекта республиканской собственности – изолированного помещения

Лот № 1 **Предмет аукциона, сведения о предмете аукциона, место нахождения имущества**	**Изолированное помещение инв. № 441/D-1136** (нежилое помещение аптеки 1977 г. п. общ. пл. 29,5 кв. м, находящееся в одноэтажном кирпичном здании; кирпичная пристройка (склад) общ. пл.15,8 кв. м; кирпичная веранда общ. пл.1,8 кв. м; кирпичный сарай пл. 46 кв. м), расположенное по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, д. Трабы, ул. Советская, д. 35а-1
Начальная цена предмета аукциона – 8 389 724 руб., сумма задатка – 838 000 руб.	
Условия продажи недвижимого имущества: ремонт нежилого помещения в течение 1 года с момента заключения договора купли-продажи	
Продавец недвижимого имущества: Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», контактные телефоны: (8 0152) 74 43 96, 74 43 92	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.grodno.by, www.gki.gov.by	

1. Аукцион состоится **23 августа 2010 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона по **19 августа 2010 года до 13.00** по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549;

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

- юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

- иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

- представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

- представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность;

- при подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность; руководителю юридического лица просьба иметь документ, подтверждающий его полномочия.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

6. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

7. Аукцион по конкретному предмету торгов признается нерезультативным, если в результате торгов данный объект не был продан в порядке, установленном законодательством, кому-либо из участников торгов.

Аукцион по конкретному предмету торгов признается несостоявшимся, если торги не состоялись в связи с отсутствием участников торгов либо наличием только одного участника.

8. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (далее – претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

9. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов возместить фактические затраты на организацию и проведение торгов; после предъявления копии платежных документов о перечислении затрат в республиканский бюджет в соответствии с условиями торгов между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 2-х рабочих дней заключается договор купли-продажи предмета торгов.

10. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

11. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества продавец вправе расторгнуть договор купли-продажи в одностороннем порядке в соответствии с действующим законодательством без компенсации расходов.

«ФРАНЦУЗСКІ СЛЕД» ЗА СОТНЮ КІЛАМЕТРАЎ АД СТАЛІЦЫ

Калі французу добра — ён п'е шампанскае. Аднак калі ўзнікаюць цяжкавырашальныя праблемы ці ўвогуле безвыходная сітуацыя, кожны нашчадак галаў перш-наперш правядзе паралелі з драматычным адступленнем напалеонаўскай арміі ў 1812 годзе. І паскардзіцца на лёс даволі цікавым чынам: «Дрэнная справа — амаль як на Бярэзіне»... Між тым, калі тая вайна «пакінула» французам даволі адметны афарызм, то нам — крыху іншыя напамінкі. Прычым гаворка не толькі пра знакамітае Брылёўскае поле. Так, не сакрэт: сёння адна з вёсак на Віцебшчыне мае па-сапраўднаму арыгінальную назву — Парыж. А ў Пухавіцкім раёне ёсць свае... Французская і Зафранцузская Грэблі.

Калісьці тут было адно балота.

Пачаткам была дарога

Каб патрапіць да канчатковай мэты, лепш за ўсё выбраць трасу Мінск — Гомель і крыху больш за 70 кіламетраў ад сталіцы зрабіць паварот налева ў вёсцы Падбярэжжа. Наступны арыенцір — даволі вялікая вёска Чырвоны Кастрычнік. Французская Грэбля будзе зусім побач. Адно, што апошні кавалак шляху давядзецца пераадольваць па грунтоўцы.

Ва ўмовах нашага білінгвізму трэба адразу ж зрабіць адну вельмі істотную заўвагу: нічога агульнага з веславаннем назва гэтай вёскі не мае. Грэбля — менавіта дарога з бярвення. Прычым праклалі яе менавіта французы, якія падчас адступлення былі вымушаныя прайсці маршам праз мясцовыя балоты тагачаснага Ігуменскага павета. Пазней, калі балота крыху падсохла, уздоўж новага шляху пачалі сяліцца людзі. Так узнікла Французская Грэбля. А за ёй — і Грэбля Зафранцузская.

Колішняга цяжкапраходнага балота ў наваколлі ўжо даўно няма. Аднак асобныя кавалкі грэблі захаваліся і па сёння. А вось адшукаць якія-небудзь іншыя «пікантныя нюансы» будзе даволі складана. Ніхто з мясцовых жыхароў з французамі не сустракаўся. Як, дарэчы, і не вывучаў у школе французскай мовы. А што да вайны, то на памяць вяскоўцаў прыходзяць хіба што падзеі Вялікай Айчыннай. Падчас яе Французская і Зафранцузская Грэблі былі спаленыя дарэшты. Балазе, яны ўсё ж здолелі адрадзіцца.

— У сакавіку 1944 года ў нашай вёсцы адбыўся вялікі бой партызанаў з немцамі, а пасля яго мы разбегліся хто куды, — узгадвае 80-гадовая жыхарка Французскай Грэблі Зінаіда Туміловіч. — І самае страшнае здарылася потым: усіх, хто паспяшаўся вярнуцца, схапілі і спалілі немцы, усяго загінула 47 чалавек. А тых, хто не вярнуўся, тыя ж немцы акружылі ланцугамі і пагналі па балотах. Памятаю, з яды выпадала адшукваць толькі першае шчаўе, балоты былі яшчэ мёрзлыя, а мы сядзелі па грудзі ў вадзе, у нас нават не было ў што пераапрануцца. Але цікава, што ніхто нават не захварэў, вось чаму я ўсім казала і буду казаць, што нельга нікалі здавацца. Гэта вы наракаеце, што сёння цяжка, але ці сустракаліся вы з цяжкасцямі насамрэч — нават не ведаю. Таму не трэба скардзіцца — жыць трэба, дзеткі.

Зінаіда Туміловіч: не Францыя, затое з вінаградам.

На дзве вёскі — тузін жыхароў

Сваёй Эйфелевай вежы ў Французскай Грэблі, зразумела, няма. Няма нават вежы воданапорнай. І здзіўляцца таму не выпадае. Так, некалі, яшчэ да вайны, вёска была цэнтрам сельсавета, мела ўласную 4-класную школу і крамку. Але тое засталося ў мінулым. На памяці мясцовых ужо паваенным часам Французская Грэбля была невялікай, тут не было ні ўласнай царквы, ні «нават сваёй фермы». А тым больш не вылучаецца гэты населены пункт буйнымі памерамі сёння.

З аднаго боку, не абышлося без звычайнай паступовай міграцыі моладзі ў гарады. Але знайшлася і «свая», у нечым асаблівая прычына. Пэўную ролю адыграла не надта ўдалая спроба рэфармавання тутэйшага сельгаспрадпрыемства. На пачатку 1990-х гаспадарка стала прыватнай, аднак справа, як кажуць, не пайшла. Аб'ёмы вытворчасці пачалі хутка змяншацца, а дзе няма вартай працы — там няма і людзей.

Сапраўды, апошнім часам пасля змены ўласніка сітуацыя змяняецца да лепшага, усё больш ворыва зноў вяртаецца «ў абарот». Але ёсць факт і іншы: сёння ў Французскай Грэблі пастаянна жыве толькі 6 чалавек, і столькі ж — у Грэблі Зафранцузскай. Прычым ці не ўсё насельніцтва ўжо пенсіянеры, адпаведна, з усіх «адметнасцяў» тут можна ўзгадаць адну аўтакраму. Да гэтага можна дадаць хіба што рэгулярныя аўтобусныя рэйсы «ў горад». ФАП, «бытоўка», школа і ўся астатняя «патрэбная» інфраструктура знаходзіцца ў Чырвоным Кастрычніку.

— Як былі жывыя ў нас мужыкі, то была і гаспадарка, мы вось мелі паўтара гектара зямлі, трымалі дзве каровы, каня, свіней, авечак — бо трэба было неяк гадаваць чацвёра дзяцей, — зазначае Зінаіда Туміловіч. — Ды я і цяпер хоць колькі градак агуркоў-памідораў, хоць колькі сотак бульбы пад рыдлёўку — а ўсё роўна пасаджу. Ведаеце, часам дзеці нават лаюцца, маўляў, мама, навошта табе тая бульба — сеткі дзве мы прывязём заўсёды. Але звычка ёсць звычка. Ды і ці можна неяк па-іншаму?

А яшчэ ў яе ёсць... свой невялікі вінаградник. Не таму, што так прынята ў Францыі, ды і самі гатункі таго ж вінограду — адаптаваныя больш да нашых, «паўночных» умоў. Проста Зінаіда Туміловіч лічыць гэта цікавым заняткам. І дадае: «Добрая гаспадыня павінна мець усё».

Дзікі, зубры і... цішыня

Ці завітае, прынамсі, напярэдадні 200-гадовага юбілею «напалеонаўскай» вайны ў Французскую ці Зафранцузскую Грэблю хтонебудзь з французаў — вялікае пытанне. А тым больш малаверагодна, што дзве маленькія вёскі змогуць ператварыцца ў буйны турыстычны цэнтр. І ўсё ж у гэтых аддаленых ад буйных прамысловых цэнтраў мясцінаў ёсць свае цікавыя асаблівасці. Тыя ж грыбы-ягады. Ці дзікі, якія без «залішніх» мераў перасцярогі могуць падысці нават пад вокны хат.

А плюс да таго нярэдкімі гасцямі наваколля застаюцца... зубры. Волаты беларускага лесу, што ў свой час былі завезеныя з Белавежжа на тэрыторыю блізкага адсюль Асіповіцкага раёна, ніякіх межаў не прызнаюць. Час ад часу вялікія статкі гэтых жывёлін з'яўляюцца каля пухавіцкіх «французскіх» вёсак — ды так, што «закрываюць усё поле».

Пры ўсім тым, ніякіх інцыдэнтаў са зверам ніколі не было. Як не было і канфліктаў паміж людзьмі. Нягледзячы на «ваенную» гісторыю з'яўлення Французскай і Зафранцузскай Грэблі, месца тут ціхае. І добрае для адпачынку. Нездарма ў вёсках ёсць «дачнікі», якія да таго ж ставяць новыя дамы. Магчыма, гэта — і сапраўды не Лазурны бераг. Але затое свой.

Сяргей ГРЫБ. Фота аўтара.
Пухавіцкі раён.

ЗВЯЗДА 21 ліпеня 2010 г.

Калі лесу горача

Пасля перамогі над лясным пажарам Аляксандр ХОЛІН можа дазволіць сабе гронку ягад.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Верталёты Мі-2 і самалёты Ан-2 (лёгкія самалёты Іл-103 у трыццаціградусную спёку ў паветра не ўзнімаюцца) з двух-трохсотметровай вышыні адсочвалі з'яўленне небяспекі і імчаліся да кожнага дыму — ці то кволага белага струменьчыка з лясного масіву, ці ўжо агромністай шызай аблачыны — каб папярэдзіць і нават спыніць вогненную стыхію, не даць агню нанесці лесу вялікай шкоды. Для паднябеснага лесапатруля гэта звычайная праца. Калі, зразумела, можна назваць звычайнымі пяць-сем гадзін, праведзеных у гарачым самалётным салоне ці пілоцкай кабіне.

— Дні з высокай дзённай тэмпературай не сталі для нас нечаканасцю, праходзяць у звычайным штатным рэжыме. Лесапатруль выявіў гэтымі днямі 49 пажараў, — каментуе працу прадпрыемства «Беллесавія» яго дырэктар Аляксей Пшонка і дадае, што частка ўзгаранняў лакалізаваная намаганнямі ўласных пажарных-дэсантнікаў, якіх цяпер у штаце 52 чалавекі. — А ў суботу і нядзелю, калі на ўлонне прыроды на адпачынак, па грыбы і ягады імкнуцца тысячы гараджан, даводзіцца дзяжурыць усяму лётнаму складу «Беллесавія».

Па зводках гэтага прадпрыемства, найбольша я колькасць лясных пажараў лётчыкамі-назіральнікамі зафіксавана ў мазырскім рэгіёне патрулявання — 17, 6 на Піншчыне, 5 — гомельскім лесапатрулём.

— Ёсць стрымліваючыя фактары, якія перашкаджаюць моцным заглыбленням агню ў глебу, асабліва ў балотах, дзе захоўваецца яшчэ дастаткова вільгаці, — тлумачыць Аляксей Пшонка. — Калі ж тэндэнцыя з высокімі дзённымі тэмпературамі будзе захоўвацца, а сіноптыкі якраз гэта і прагназуюць, прырода можа апынуцца на парозе бяды. Вядома, нам давядзецца працаваць у самым узмоцненым рэжыме, налётваць па шмат гадзін, задзейнічаць усе авіябарты, увесь лётны склад.

Працягласць маршруту патрулявання экіпажам Полацкага лётчыка-назіральніка Уладзіміра Пірага, у складзе якога давялося праляцець і мне, складае 416 кіламетраў. Гэта калі ляцець па дакладна вызначаным маршруце без адхіленняў, пасадак і ўзлётаў. Але ў лётчыкаў не прынята лічыць кіламетры, іхняя праца вымяраецца налётам гадзін. А ў парашутна-дэсантна-пажарных — яшчэ ў колькасці ліквідаваных вогнішчаў і плошчы патушанай тэрыторыі. Але выбіраць умовы і складанасць пажарнай бяспекі гэтай катэгорыі ахоўнікаў прыроды не даводзіцца. Сяргей Савуцін і Аляксандр Холін — ліквідатары лясного пажару пад Дрэтунню — змагаліся з агнём амаль гадзіну, выкарыстоўваючы толькі даступны арсенал — рыдлёўкі, гумавыя заплечнікі з вадою і бярозавыя галіны. Лёгкі вецер і сухая ігліца былі для агню нібы тое масла, і полымя ўпарта рухалася з аднаго боку на стары лес, з другога — на маладыя пасадкі. Але байцы дакладна разлічылі самыя небяспечныя накірункі наступу агню, збілі вадою моцнае полымя, закідалі пяском і да падыходу работнікаў бліжэйшага лясніцтва не давалі агню распаўсюдзіцца. І толькі пасля, вяртаючыся да верталёта, дазволілі сабе ўсміхнуцца і набраць па жмені чарніц.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Зверху бачна любое ўзгаранне. З гэткага ачага магло ўтварыцца стыхійнае бедства.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (16 ліпеня). Па гарызанталі: Крыжаноўскі. Каін. Бос. Куб. Жаба. Шпага. Малаві. Ласты. Ада. Фарсі. Лён. Клема. Сок. Ніт. Піка. Галкін. Багамаз. Вар. Опера. Кока. Ананд. Балід. Шпат. Таўкач. Кола. Таўро. Кастапраў. **Па вертыкалі:** Афтальмолаг. Ава. Бланк. План. Ікра. Жванецкі. Нектар. Аід. Анод. Жако. Агат. Шоўк. Аскал. Серп. Кок. Апала. Омнібус. Байт. Час. Шыфрын. Ітака. Агрэст. Мол. Сакі. Аўстралійка. Задорнаў.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.05	21.26	16.21
Віцебск —	4.48	21.22	16.34
Магілёў —	4.55	21.16	16.21
Гомель —	5.00	21.05	16.05
Гродна —	5.22	21.40	16.18
Брэст —	5.30	21.33	16.03

Месяц

Першая квадра 18 ліпеня. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Пракопа.*

К. *Андрэя, Віктара, Данеля.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

І Ў 33 ТОРКАЕ!

Захапленні

НАВАТ у вялікую спякоту прафесійныя рыбакі за некалькі гадзін бяруць да 4-х кілаграмаў рыбы. У выхадныя ў Кіраўскім раёне прайшоў чарговы этап чэмпіянату Беларусі па спартыўнай лоўлі рыбы паплаўковай вудай.

Пакуль у суботу і нядзелю тэмпература паветра ў беларускіх гарадах усталёўвала новыя рэкорды, у глыбінцы, на Чыгірынскім вадасховішчы каля ГЭС, сабраліся вялікія аматары рыбалкі. Больш за 30 удзельнікаў беларускага чэмпіянату па спартыўнай лоўлі рыбы прыехалі з Магілёва, Мінска, Брэста і Маладзечна. Спаборнічалі 7 камандаў і рыбакі-індывідуалы.

У першы дзень суддзяў і ўдзельнікаў турбавалі не столькі спякота, колькі дзіўнае цвіценне вадаёма. Белая пена з зялёнымі адценнямі, якая прыбілася да берага, нават паставіла пад сумнеў правядзенне этапу. Аднак усё ж рыбакі вырашылі змагацца, і ўрэшце атрымалі неблагія вынікі.

Вялікае ўражанне на публіку, якая сабралася на Чыгірынскай ГЭС, зрабіў этап падрыхтоўкі да лоўлі, калі рыбакі больш за дзве гадзіны разгортвалі свае вуды і прыстасаванні, прыкормлівалі рыбу.

— Каб падрыхтаваць працоўнае месца, сапраўды патрабуецца шмат часу, — тлумачыў мінчанін Аляксандр Яўмененка. — Платформа павінна ўстойліва стаяць на няроўным беразе, каб надзейна сядзець і каб усе неабходныя рэчы былі пад рукамі.

Дарослыя і дзеці з цікаўнасцю разглядалі зборныя вуды, даўжыня якіх дасягала 13 метраў, і параўноўвалі іх з 5-павярховымі жылымі дамамі. Увогуле, прафесійнае рыбалоўнае абсталяванне каштуе, як сярэдняя патрыманая іншамарка — у раёне 5 тысяч долараў.

— Гэта не рыбалка, а спорт, праверка сваіх маральных і фізічных якасцяў, — сказаў Алег Закрыжэўскі з каманды «Матчфішынг», якая стала пераможцам 2-га этапу беларускага чэмпіянату. — Тут, як у спорце, правяраецца — хто мацнейшы.

Праверка гэтым разам праходзіла ва ўмовах спякоты.

— І ў 33 градусы таксама торкае, але ўсё ж спякота адбіваецца і на рыбе, якая робіцца вялай, і на нас, рыбаках, — тлумачылі ўдзельнікі спаборніцтваў і абліваліся халоднай вадой.

Лепшыя ўловы другога дня амаль дасягалі 4-х кілаграмаў. Такі вынік, у прыватнасці, паказаў пераможца сярод рыбакоў-індывідуалаў Канстанцін Ціханаў.

Лавілі ў асноўным плотак і падлешчыкаў. Самыя буйныя рыбіны дасягалі кілаграма. Гэты вынік, праўда, далёкі ад асабістых рэкордаў таго ж Алега Закрыжэўскага: ласось — 36 кілаграмаў, сом — 80, а шчупак —11. Але рыбак прызнаўся, што ён і яго калегі і супернікі атрымалі вялікае задавальненне ад сапраўднай рыбалкі ў маляўнічым месцы Магілёўшчыны.

А ўвечары, пасля спаборніцтваў, калі сонейка пякло ўжо не так моцна, у Чыгірынцы адбылося вялікае свята, якое наладзіў Кіраўскі раён. На сцэне каля вады выступалі артысты, Нептун з русалкамі праводзілі конкурсы, дзеці плюхаліся ў спецыяльным басейне, а дарослыя гатавалі юшку. Кіраўніцтва раёна ўзнагародзіла пераможцаў спаборніцтваў па плаванні і рыбнай лоўлі сярод аматараў.

Ілона ІВАНОВА.

Кіраўскі раён.

ФЕСТЫВАЛЬ ГУМАРУ Ў СПОРАВЕ

КАЖУЦЬ, сустрэліся аднойчы Гора і Радасць і вырашылі пажаніцца. Ад іх кахання нарадзіўся Гумар. Жарт — хвілінка, а зараджае надоўга. А калі апынешся ў самым сэрцы краіны са сталіцай гумару Спорава, то і жывот надарвеш, і ад смеху праслязішся.

Спораўцы — людзі таленавітыя і патрабавальныя ва ўсіх адносінах. Захацелі і дамагліся таго, што да іх курсіруе аўтобус з Брэста. Дзе б яны ні рассяляліся, а сувязь паміж сабой трымаюць. На гэты раз яны выйшлі ў адкрытае мора, бо возера, да якога на некалькі кіламетраў прытулілася вёска з насельніцтвам больш за тысячу чалавек, упадае ў раку Ясельда, Ясельда — ў Піну, Піна — у Днепр, а там і да Чорнага мора рукой падаць. На Спораўскім возеры адкрываецца порт «Азёрны». Караблі адпраўляюцца ў плаванне па спораўскіх курантах два разы ў суткі. Вяскоўцы шмат дзе былі, многае бачылі. У Маскве ім найбольш спадабаліся Куранты. А чым жа сталіца гумару Спорава горшая? І збылася даўняя мара: ва ўрачыстых абставінах 17 ліпеня тут праз шматлікае «Ура!» адкрываюцца Куранты.

З выхадам на міжнародную арэну праз водны шлях спораўцы гатовыя пабудаваць рыбаперапрацоўчы завод і выпускаць калі не шпроты, дык карася ў тамаце. Эмблема яго ўжо з'явілася на беразе.

А чаму б не пажартаваць?! Гэта некаторыя кавалачкі сцэнарыя, паводле якога ладзіўся чацвёрты абласны фестываль гумару «Спораўскія жарты». Нягледзячы на невыносную спякоту, два выхадныя дні тут было столькі смешнага, што не перадаць, не пераказаць. Трапныя слоўцы і смешныя музычныя нумары сюды звезлі артысты з усіх куткоў Брэстчыны і на-ват з замежжа.

Аляксей ГАНЧУК. Фота аўтара.

Бярозаўскі раён.

ПАЛАМАНЫ ДУБ У ЛОШЫЦЫ ВЫКАРЧОЎВАЦЬ НЕ БУДУЦЬ

У мінулыя выхадныя векавы дуб — сімвал Лошыцкага парка — не вытрымаў моцных парываў ветру і, разламаўшыся, рухнуў. Цяпер ад некалі магутнага велікана засталося ўсяго толькі паўтара метра ствала, які тырчыць з зямлі.

Як паведаміў намеснік дырэктара Лошыцкай садова-паркавай гаспадаркі Мікалай Сечка, верхнюю частку дрэва адправяць на звалку, а ніжнюю абгародзяць і побач паставяць шыльдачку. Такім чынам, маладыя па-ранейшаму, згодна са сталай традыцыяй, змогуць прасіць у сімвала Лошыцкага парка кахання і шчасця.

Дарэчы, дакладны ўзрост дрэва ніхто не ведае. Па вопісу дубу 190 гадоў, па гадавых колах на спіле — усе трыста, а па легендзе і таго больш — чатырыста.

Алена КЛІМКОВІЧ, «Мінск-Навіны».

ДЗІЦЯ ШУКАЮЦЬ УСЕ

У Петрыкаўскім раёне 12-гадовы хлопчык з сіндромам Даўна пайшоў разам са сваякамі па ягады ў лес. Праз тры гадзіны бацькі, жыхары вёскі Капцэвічы, зразумелі, што дзіцяці побач няма. Зараз яго вышукам займаюцца ўсе службы: міліцыя, выратавальнікі, леснікі, грамадскасць — каля 50 чалавек. Абследавана тэрыторыя каля населеных пунктаў Капцэвічы, Брынёў і Славінск Петрыкаўскага раёна. Як паведаміў **начальнік аддзела вышуку Петрыкаўскага РАУС Алег ЯРМОЛІЧ**, пакуль што плённых вынікаў няма. Прынята рашэнне, што на пошукі дзіцяці будзе накіравана дадаткова 50 ваеннаслужачых.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Дзве даты

21 ліпеня

1915 год — у Мінску было створана Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны — дабрачынная арганізацыя для аказання дапамогі бежанцам Першай сусветнай вайны. Дзейнічала да сярэдзіны 1920-х гадоў. У розны час у яго ўваходзілі В. Іваноўскі, В. Ластоўскі, Цётка (А.Пашкевіч) і іншыя. Арганізоўвала пункты харчавання, сталовыя, інтэрнаты, аказвала медыцынскую дапамогу ўцекачам. Адкрыла Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, аддзелы ў Дзісне, Вілейцы, Друскенікаў, Полацку і інш. Групавала вакол сябе дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, было прадстаўніком нацыянальных інтарэсаў беларускага народа перад германскімі акупацыйнымі войскамі. Праводзіла культурна-асветніцкую работу, стварыла школьную камісію, адкрыла першыя беларускія школы.



1899 год — нарадзіўся Эрнест Хемінгуэй, славуты амерыканскі пісьменнік. Ён быў вядучым аўтарам так званага «страчанага пакалення» і, напэўна, самым вядомым пісьменнікам свайго часу. Ён распрацаваў простую і свежую манеру напісання — стрыманую, эканомную, аб'ектыўную, набліжаную да гутарковай гаворкі. Яго памятаюць і любяць ва ўсім свеце, па некалькі раз перачытваючы раманы «Фіеста», «Бывай, зброя!», «Па кім звоніць звон», аповесць-прытчу «Стары і мора» і іншыя.

Цытата дня:

«Калі мы ведаем, што рана ці позна смерць чакае нас, то чаму б нам зараз не пажыць у сваю асалоду».

Гай Петроній (I ст. н.э.), рымскі пісьменнік.

КАНКУР, МАНЕЖ І КРОС

Напярэдадні

Напрыканцы тыдня, з 22 па 25 ліпеня, у п. Ратамка пройдзе этап Кубка свету па трохбор'і. Чакаецца, што ў спаборніцтвах прымуць удзел спартыўныя пары з пяці краін — Літвы, Эстоніі, Румыніі, Беларусі і Расіі (прычым большасць удзельнікаў будзе менавіта адсюль).

У чацвер і пятніцу (22-23 ліпеня) у 10.00 пройдзе манежная язда. У суботу, 24 ліпеня, адбудуцца самыя цікавыя і відовішчныя спаборніцтвы — крос, пачатак якога намячаецца на 9.00, а ў нядзелю (25 ліпеня) канкур (пачатак у 11.00). Уваход на ўсе віды спаборніцтваў вольны.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Трэці год працуе ветэрынарная клініка, дзе коням аказваецца любая дапамога. Ветэрынарны ўрач Алена СТАЛЬМАШОНАК праводзіць лячэнне «хворых».

Абярэг ад чужых жонак

У адзенні ўсходніх славян пояс меў велізарнае значэнне. Выйсці на вуліцу без пояса, роўна як і зайсці ў царкву без крыжа, — лічылася вялікім грахом. Падпярэзваць трэба было сподняе, хатняе і, абавязкова, верхняе адзенне як мужчынам, так і жанчынам. Лічылася, што пояс будзе суправаджаць чалавека ад яго нараджэння да смерці. Калі з кашулі можна вырасці, то пояс, які давалі дзіцяці адразу пасля нараджэння (яго спавівалі і перавязвалі поясам) служыў яму значна даўжэй.

● Як правіла, першы раз хлопчыку надзявалі штаны ў сем гадоў, а без пояса, якім ён падпярэзваў доўгую кашулю, выйсці за вароты было недапушчальна. Расперазаць чалавека, г. зн. зняць з яго пояс, прыраўноўвалася да вялікай ганьбы. І сёння пра злаславіва, нястрыманага чалавека, забіяку, які спрабуе даказаць сваю праўду кулакамі, гавораць «распярэзаны» — г. зн., які страціў сорам і прыстойнасць.

● Пояс станавіўся галоўным атрыбутам на вяселлях і ў сямейным жыцці. У Навагрудскім і Ваўкавыскім раёнах Гродзенскай вобласці нявеста павінна была пасля сватаўства «падпярэзаць» бутэльку, у якую маці насыпала трохі збожжа, на «запоінах» падпярэзаць жаніха, на «другіх запоінах» — свата.

● У храме падчас шлюбу пры дапамозе пояса нявеста магла «запраграмаваць» будучыя роды. Для гэтага перад ад'ездам нявеста сыпала сабе за пазуху дробку льнянога насення, а калі стаяла перад алтаром, імкнулася неўпрыкмет аслабіць «паясніцу», каб насенне пасыпалася на падлогу. З гэтай жа мэтай рабілі і так: «Маладая, едучы ды шлюбу, адпускае тасёмкі фартуха і спадніц, каб былі лёгкія роды».

● Паўсюдна быў вядомы такі звычай: як толькі жаніх і нявеста выходзілі з храма, хросны бацька нявесты злучаў рукі маладых поясам і стукаў іх галовамі, прыгаворваючы: «Каб жылі добра і гладка» .

● Лічылася, што пояс павялічвае мужчынскую сілу, а чырвоны пояс, падараны жонкай мужу, ахоўвае «яго ад хвацкага вока, нагавораў і чужых жонак».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Ці думалі мы, што будзем з нецярплівасцю чакаць адпачынку, каб паехаць у халодныя краіны?!

☺

Той, хто па-ранейшаму лічыць жанчын слабым полам, хай паглядзіць, як яны зачыняюць дзверы ў маршрутцы.

☺

Жаніх з нявестай абмяркоўваюць будучае сумеснае жыццё.

— Абяцай мне, дарагі, што ты завяжаш з курэннем.

— Так, каханая.

— І з выпіўкай таксама?

— Так, мілая.

— І завяжаш хадзіць у клуб па вечарах.

— Гэта ўсё?

— Дай падумаю, з чым яшчэ ты зможаш завязаць...

— З жаніцьбай.

☺

Дзве магільныя пліты. На адной напісана: «Тут ляжыць самы вядомы напарстачнік у свеце!». І на другой: «Ці тут!»

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3516. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12